Літаратурная Беларусь

Выпуск №5 (153)
(травень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест



Фота www.people.onliner.by

Дым і агонь



Віктар САЗОНАЎ

Дыму без агню не бывае. Прынамсі так гаворыць старадаўняя мудрасць, вядомая яшчэ з тых дапатопных часоў, калі зямля плавала на трох кітах. Усё далейшае развіццё чалавецтва толькі пацвярджала праўдзівасць гэтых слоў. Не згубілі яны сваю актуальнасць і сёння.

На пачатку пра дым. У інтэрв'ю радыё «Срэбны дождж» вядомы расійскі журналіст і публіцыст Мікалай Сванідзэ заявіў, што да яго з Менску дайшоў слых, нібыта дзейсны кіраўнік Расійскай Федэрацыі прапанаваў не менш дзейснаму кіраўніку Рэспублікі Беларусь стаць сапраўдным дзейсным прэм'ер-міністрам Расеі ажно на шэсць наступных гадоў. Зразумела, гэта ўсё не проста так, і не за неверагодна высокія гаспадарскія дасягненні дадзенай беларускай кандыдатуры ў галіне эканомікі, ну і зразумела, што не за прыгожыя вочы. Гэтая ўсходняя прапанова мажлівая, маўляў, толькі ў абмен на ўсю Беларусь з усімі яе амаль дзесяцці мільёнамі рускамоўнага насельніцтва.

Даведка... Калі хто не ведае, Мікалай Сванідзэ ёсць прадстаўніком яшчэ той старой, на сённяшні дзень ужо не моднай інфармацыйнай школы, у якой проста так языком не мятуць, а ўзважваюць кожнае слова. Таму што маральна-этычныя крытэры і праўдзівасць кожнага зляцелага з вуснаў выказвання лічаць не толькі прафесійнай этыкай, але і жыццёвай неабходнасцю. Таму каму-каму, а Мікалаю Сванідзэ верыць можна.

Ідзём далей. Такога прыніжэння мала якая краіна і мала які яе начальнік зведалі. Ні кіраўніку Малдовы, ні Узбекістана, ні Казахстана, ну і зразумела, што ні кіраўнікам Украіны, ні былому ні цяперашняму, такія прапановы не паступалі. Ёсць над чым задумацца. А тут вось так проста, па-сваяцку, у прыяцельскім тоне — раз, і пагаварылі. Дажыліся! Нічога не скажаш.

І што вы думаеце, дуэлі пасля гэтай кінутай пальчаткі (калі такое было насамрэч) не адбылося. Прынамсі ў нашым эстэтычна-арыстакратычным уяўленні пра дуэлі. Хоць, можа, сённяшнія дуэлі вядуцца па іншых правілах, і вымушанае адкліканне з Беларусі расійскага амбасадара Міхаіла Бабіча і ёсць «наш адказ Чэмберлену». Хто яго ведае. Пажывём — пабачым.

Вялікая яна, Расія, толькі не густа населеная. Вось мільён-другі баяздольных чалавек і не пашкодзіць. Асабліва такіх, ужо абстраляных, як з Луганшчыны і Данеччыны, ці такіх з дзяцінства партызан, як з Беларусі. Ды што там гаварыць. Усялякія патрэбныя

Гэта было пра дым. Ну а цяпер пра агонь. Ну вось настолькі расшчодрыўся кіраўнік Расійскай Федэрацыі з прапановамі і падарункамі направа і налева, што нават для шырокай расійскай душы гэта ўжо занадта. Тут, паводле Мікалая Сванідзэ, крэсла прэм'ера аддае, там для жыхароў некаторых раёнаў Луганскай і Данецкай абласцей прапаноўвае за «бардзэ дзенькуе» грамадзянства Расійскай Федэрацыі. Выглядае так, што яго ўжо не спыніць у бязмернай «шчодрасці». Якога новага падарунка ад яго чакаць і каму? Можа, Нурсултан Назарбаеў і аддаў сваё пажыццёвае права кіраваць Казахстанам, бо па логіцы рэчаў у такой святочнай атмасферы і ён без падарункаў наўрад ці пакінуць. А Нурсултану Абішавічу хіба яны не асабліва патрэбныя?

Лагічна паўстае пытанне: а навошта такая шчодрасць патрэбная самому расійскаму кіраўніцтву? Бо калі хто думае, што толькі праз Саюзную дзяржаву Беларусі і Расіі расійскі начальнік можа захаваць свой трон, той увогуле не разумее, што гэта такое — трон расійскі. Калі на яго хто залазіць, то сам злезці ўжо не можа. І аніякія новыя дзяржаўныя ўтварэнні для гэтага зусім не патрэбныя. А вось новыя салдаты Расіі былі патрэбныя заўсёды. Ну калі паваяваць хацелася... А галоўнае — заўсёды ёсць з кім паваяваць. Так гістарычна склалася. Вялікая яна, Расія, толькі не густа населеная. Вось мільён-другі баяздольных чалавек і не пашкодзіць. Асабліва такіх, ужо абстраляных, як з Луганшчыны і Данеччыны, ці такіх з дзяцінства партызан, як з Беларусі. Ды што там гаварыць. Усялякія патрэбныя.

Расія заўсёды ваявала людзьмі. Лішніх у яе не бывае. Лішнія адсейваюцца самі па сабе на полі бою. Ну а бой заўсёды будзе, калі ёсць лішнія салдаты. Некуды ж іх трэба дзяваць...

Вось вам і дым, вось вам і агонь. Ну а як жа без агню, калі і дровы даўно нарыхтаваныя, і распалка, і запалкі ляжаць на відным месцы. Не прападаць жа дабру. А там хто рукі нагрэе на тым агні, а хто азадак прапаліць, — гэта ўжо як каму пашанцуе. Ці не пашанцуе. Кожны думае, што патрапіць у першую катэгорыю. Толькі вось гэта далёка не факт.

racyja.com



Прэмія імя Наталлі Арсеннёвай

Распачаўся прыём заявак на Прэмію імя Наталлі Арсеннёвай за найлепшую паэтычную кнігу на беларускай мове.

Крытэры для падачы кніг: 1) паэзія; 2) кніга выдадзеная ў 2018 годзе (кніга, якая была выдадзеная ў 2017, але па нейкіх прычынах не была пададзеная на мінулагоднюю прэмію, можа быць намінаваная ў гэтым годзе); 3) мова кнігі — беларуская.

Калі кніга выдавалася ў папяровым выглядзе, два папяровыя асобнікі трэба перадаць альбо пераслаць поштай на адрас Саюза беларускіх пісьменнікаў (Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, 31-906). Заяўкі прымаюцца да 14 чэрвеня.

Падаць заяўку і намінаваць кнігу на прэмію могуць аўтары, выдаўцы, творчыя аб'яднанні, аргкамітэт Прэміі і сябры журы. Пераможцу вызначаць вядомыя паэты і літаратуразнаўцы.

Прэмія за найлепшую кнігу паэзіі была заснаваная ў 2017 годзе ў гонар Наталлі Арсеннёвай — выбітнай беларускай паэткі, зоркі літаратуры Заходняй Беларусі, аўтаркі знакавага верша «Магутны Божа».

У 2018 годзе прэмію атрымаў Алесь Разанаў за кнігу «Перавыбранае», а ў 2017 — Уладзімір Някляеў за кнігу «Толькі вершы».

Арганізатарамі прэміі з'яўляюцца Саюз беларускіх пісьменнікаў, Беларускі ПЭН-цэнтр і Згуртаванне «Бацькаўшчына». Літаратурная прэмія імя Наталлі Арсеннёвай заснаваная пры спрыянні Фонда культуры і адукацыі Орса-Рамана і Харытатыўнага фонда Згуртавання беларусаў Вялікай Брытаніі.

Конкурс «Экслібрыс» імя Анатоля Сыса

У год, калі Анатолю Сысу споўнілася б 60, Саюз беларускіх пісьменнікаў абвясціў пра пачатак прыёму прац на конкурс для маладых літаратараў «Экслібрыс». Сёлета конкурс будзе прысвечаны паэтычным творам.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца паэты ва ўзросце да 35 гадоў. Прымаюцца толькі тэксты, не апублікаваныя ў друку.

У журы сёлетняга конкурсу ўвайшлі Валянціна Аксак, Леанід Галубовіч, Леанід Дранько-Майсюк, Таццяна Нядбай, Уладзімір Сціпан.

Тэксты на конкурс можна дасылаць файламі ў фармаце .doc(.docx) да 1 кастрычніка 2019 года на адрас sbp@lit-bel.org, пазначыўшы тэмай ліста «Конкурс». У лісце мусіць быць наступная інфармацыя: імя, прозвішча, дата нараджэння ўдзельніка, кантактны нумар тэлефона і e-mail.

Падвядзенне вынікаў і цырымонія ўзнагароджання пераможцаў адбудуцца ўвосень, да юбілею Анатоля Сыса. Па выніках конкурсу мяркуюцца публікацыі ў часопісе «Дзеяслоў», дадатку «Літаратурная Беларусь» пры газеце «Новы Час».

Штогадовы конкурс для маладых літаратараў «Экслібрыс» заснаваны Саюзам беларускіх пісьменнікаў 7 гадоў таму і штораз мае новую тэму. Першы ў 2012 годзе быў прысвечаны класікам-юбілярам беларускай літаратуры Паўлюку Багрыму, Якубу Коласу, Янку Купалу, Алесю Гаруну, Цішку Гартнаму, Максіму Танку, Янку Брылю і Міхасю Стральцову, другі (2013) — Янку Маўру, трэці (2014) — Аляксандру Уласаву, чацвёрты (2015) — Рыгору Барадуліну, пяты (2016) — Антону Луцкевічу, шосты (2017) — 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і Францыску Скарыну. У 2018 годзе «Экслібрыс» быў прысвечаны 100-годдзю Беларускай Народнай Рэспублікі.

Прэс-служба СБП

Класік і міфы

Таямніцы Дуніна-Марцінкевіча / Зміцер Дрозд. — Вільня: Беларускі дакументацыйны цэнтр, 2018. 572 с.



Кніга Змітра Дразда «Таямніцы Дуніна-Марцінкевіча» — даследаванне грунтоўнае, інтрыгоўнае, поўнае жывой цікавасці да айчыннай літаратуры, ці, дакладней, — асобы аднаго з найбольш вядомых беларускіх творцаў XIX стагоддзя. Крытычныя развагі над даследаваннямі папярэднікаў, чатыры гады працы ў архівах, дзясяткі публікацый у перыядычным друку, і ў выніку — кніга на 570 старонках пра Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, яго сям'ю, Мінск сярэдзіны XIX стагоддзя, дзе вобраз класіка на думку адных чытачоў «дэманізуецца і крыміналізуецца», на думку іншых — проста ўдакладняецца паводле архіўных дакументаў.

Нельга не параўнаць гэтую кнігу з выдатным даследаваннем Генадзя Кісялёва «Жылі-былі класікі: хто напісаў паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе»». Тут адчуваецца тая ж бадзёрасць, захопленасць, радасць новых знаходак... Кнігу Змітра Дразда можна аднесці да ўмоўнага жанру «даследаванне-дэтэктыў», бо сярод безлічы дакументаў трэба знайсці тыя, што маюць неабвержнае дачыненне да героя гісторыі, дазваляюць рэканструяваць падзеі мінулага.

Як у кожным паважаным выданні, разлічаным на ўвагу навукоўцаў, тут ёсць тэксты шматлікіх дакументаў, якія публікуюцца ўпершыню (агулам 165 старонак), і копіі некаторых з іх, спіс апублікаваных дакументаў, асабовы і геаграфічны паказальнікі. Разам з тым, даследаванне чытаецца лёгка, бо Зміцер Дрозд па ўласных словах «часта імкнуўся пісаць не навуковай мовай, а займальна — таму і кніга ў цэлым навукова-папулярная».

Якія таямніцы раскрываюцца ў кнізе?

Першая — загадкавае сваяцтва Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча з мітрапалітам усіх рымска-каталіцкіх цэркваў Расійскай Імперыі Станіславам Богуш-Сестранцэвічам. Зміцер Дрозд адзначае, што крэўнага сваяцтва паміж імі не было. «Дачка роднай сястры мітрапаліта Ганны Рыкачэўскай Людавіка выйшла замуж за Яна Марцінкевіча, менавіта ад іх і паходзяць зводныя паэта — брат Ігнацій Марцінкевіч і сястра Францішка». Людавіка была першай жонкай бацькі паэта, і памерла пасля 1781 года. Як сведчаць шматлікія дакументы, Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч апекаваўся сваімі пляменнікамі і дапамагаў сям'і Марцінкевічаў, нават калі Ян Марцінкевіч ажаніўся другі раз — з будучай маці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча Марцыянай Нядзвецкай.

Другое важнае ўдакладненне — абвяржэнне міфа пра сіроцкае дзяцінства Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Гэты міф грунтуецца на ўласных словах паэта («з дзяцінства асірацелы і маючы нядбайную радню...»). Вінцэнт сапраўды рана страціў бацьку (на час смерці Яна Марцінкевіча яму было толькі 3 месяцы), але яго маці Марцыяна пражыла 62 гады, выдала замуж абедзвюх дачок, жыла з сям'ёй дачкі Алены ў фальварку Юззэфова, дзе і склала тэстамент з улікам інтарэсаў свайго дваццацідвухгадовага сына.

Ці быў Марцінкевіч «Дуніным»? Гэтае пытанне, бадай, найбольш захапіла даследчыка, і на падставе шматлікіх дакументаў ён робіць выснову, што знакаміты паэт Дунінам-Марцінкевічам не быў, і ўзяў сабе «прыдомак», найверагодна, каб «далучыцца да старажытнага роду». Зміцер Дрозд адзначае, што ў ніводным з вядомых яму дакументаў прозвішча Дунін-Марцінкевіч «не згадваецца датычна продкаў ці самога Вінцэнта». На просьбу Змітра Дразда спецыяліст Яўген Глінскі выканаў экспертызу дакументаў, якія паэт падаваў у Мінскі дваранскі дэпутацкі сход, каб пацвердзіць шляхецтва. Атрымалася, што з 12 дакументаў 7 — фальшыўкі, 4 — сумнеўныя, 1 застаўся без ацэнкі. Безумоўна, род паэта быў вельмі паважаны, але прыдомкам «Дунін» яго продкі дакладна не карысталіся.

Чацверты істотны момант: Зміцер Дрозд здолеў разблытаць пакручастыя лёсы дачок Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Мы шмат ведаем пра шчырую патрыётку Камілу — піяністку, кампазітарку, удзельніцу нацыянальна-вызваленчага руху. Але жыццё яе сясцёр, імёны якіх нярэдка блыталі даследчыкі, таксама вельмі цікавае. У Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча было чатыры дачкі: Каміла, Элёдыя, Цэзарына і Яўгенія-Эмілія. Жыццю Камілы і Марыі-Элёды прысвечаны асобныя раздзелы кнігі.

Чытачы, якія раней не вельмі паглыбляліся ў біяграфію паэта, знойдуць у кнізе безліч іншых цікавостак: пра спадчыну ад ксяндза Валяр'яна Дзюрдзевіча, якую паэт так і не атрымаў, пра сваяцтва (але не крэўнае) Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча з Аляксандрам Пушкіным, пра выбітнага пляменніка нашага паэта — Станіслава Парчэўскага, які выратаваў Адама Міцкевіча і Эдварда Адынца ад смерці, пра праўнучку беларускага класіка Беату-Хрысціну Марцінкевіч, якая насамрэч аказалася яго далёкай пляменніцай...

Шмат увагі надаецца Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу як фальсіфікатару шматлікіх дакументаў аб шляхецкім паходжанні, аднаму з удзельнікаў «сіндыката падробак». У лістападзе 1835 года ён патрапіў у Мінскі турэмны замак праз паказанні аднаго з галоўных фальсіфікатараў Марціна Чапкоўскага — і каля тыдня знаходзіўся за кратамі. 16 верасня 1844 года мінскі губернатар атрымаў данос ад селяніна Юзафа Душкевіча пра тое, што Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч вырабляе «падложныя» дакументы. Але ў час «экстраннагаператрусу» нічога знойдзена не было.

Ёсць падставы меркаваць, што паэт неаднойчы парушаў закон. Падрабляў дакументы, патрэбныя як доказы шляхецтва. Дрозд нават плануе выдаць кнігу «Падроблена Марцінкевічам». Але ва ўсіх дакументах Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч тлумачыў свае ўчынкі паводле прэзумпцыі невінаватасці: ён дабранадзейны чалавек, які ніколі нічога ніядобрага не рабіў і нават не дапускаў у думках, і раптам праз хлусню і паклёпы зацікавіў праваахоўныя органы. Такім чынам, пасля затрыманняў і арыштаў паэт штораз выходзіў сухім з вады, хаця і заставаўся на падазрэнні. Можна меркаваць, што Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч быў добрым хітруном, але трэба мець на ўвазе, што жыхары нядаўняй Рэчы Паспалітай не вельмі паважалі царскую ўладу, пра што яскрава сведчаць нацыянальна-вызваленчыя паўстанні. Нават у статусе чыноўніка Расійскай імперыі Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, магчыма, не бачыў праблемы ў тым, каб зарабіць на абмежаванасці ці неабачлівасці расійскіх калег. Яго дачка Каміла была больш прынцыповая і катэгарычная, але Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч дакладна не шукаў праблем на сваю галаву.

Знаходзяцца і іншыя дакументы, якія сведчаць, што Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч быў далёка не ўзорам дабрачыннасці. Цікавая, напрыклад, гісторыя пра «званы на спачын душы», якія замовілі паэту за нявернутую пазыку. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч нават сустрэў людзей, якія неслі яму саван і пахавальныя падсвечнікі. Пасля гэтага здарэння Станіслаў Манюшка ў лісце да жонкі атэставаў творцу як «не да канца сумленнага чалавека» і параіў больш да яго не пісаць.

Безумоўна, наш паэт быў асобай каларытнай, супярэчлівай, і названая кніга дазваляе больш даведацца пра яго жыццёвыя перыпетыі (галоўная з якіх — шлюб з Юзэфай Бараноўскай), удакладніць лад мыслення і сацыяльныя погляды. Да таго ж, кніга Змітра Дразда — гэта кніга пра Мінск Дуніна-Марцінкевіча, бо паміж Панюшкавічамі і Люцынкай неяк губляецца тое, што ў Мінску спадар Вінцэнт правёў нямала часу, і, як прынята пісаць, мінскія вуліцы добра памятаюць крокі паэта.

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч працаваў у Мінскім губернскім межавым судзе і ў Рымска-каталіцкай духоўнай кансісторыі, у 1835 годзе ён стаў сведкам пажару, якія нярэдка здараліся ў горадзе; у Бернардынскім манастыры (цяпер — Свята-Духавым Кафедральным саборы) маладая жонка паэта каля трох тыдняў знаходзілася пад наглядам пасля «падпольнага» шлюбу; недзе ў Мінску была канспіратыўная кватэра Камілы Марцінкевіч — і тут яна выліла начны гаршчок на галаву мінскаму губернатару... Гэты пералік можна доўжыць, і калі назахапляльная экскурсія па Мінск часоў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча яшчэ не прапануецца турыстам, то ў бліжэйшы час яна дакладна мае з'явіцца.

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і яго сваякі — адметныя героі сваёй эпохі, таму кніга Змітра Дразда прывабіць самых розных чытачоў. Як адзначае аўтар, беларусам XXI стагоддзя нецікавыя адназначныя «забранзавелыя» асобы: «Дунін-Марцінкевіч быў нашмат цікавейшым, шматграннейшым, і яго партрэт цалкам немагчыма маляваць толькі белай фарбай. Ён жыў у складаны час, у якім умудрыўся не толькі пражыць вялікае і насычанае жыццё, але і пакінуць нам багатую спадчыну».

Алеся Лапіцкая

Верыць свайму густу, ісці сваёй дарогаю


Андрэй Федарэнка — з кагорты маіх найлюбімых творцаў.

Усё ягонае (апавяданні і аповесці, эсэ і раманы, «сечку», а таксама годныя і дасціпныя адказы на пытанні тых сумоўцаў, што ладзяць з ім гутаркі) чытаць прыемна і карысна.

У адной з гутарак Андрэй Федарэнка сказаў: «Калі ўжо выбраў сваёй дзейнасцю літаратуру — стаў перад сабой самыя высокія мэты». Сказаць так мог толькі адметны пісьменнік. Ён такім, дарэчы, і стаўся, на той час ужо аўтар цэлага шэрагу яскравых аповесцяў: «Вёска» (1995), «Цугцванг» (1998), «Шчарбаты талер» (1999), «Нічые» (2001), «Афганская шкатулка» (2002). А да гэтага, у свае трыццаць, падараваў свету другую па ліку кнігу «Смута», наклад якой склаў 6000 асобнікаў.

Яна выйшла ў свет у 1994 годзе. Неўзабаве была ўганаравана Літаратурнаю прэміяй імя Івана Мележа. Я, калі прачытаў кнігу, зразумеў: у беларускую нацыянальную літаратуру прыйшоў талент ад Бога. Шмат што перачытваў і радаваўся. Ды і дагэтуль перачытваю. Асабліва моцнае і незабыўнае ўражанне займеў ад апавядання «Пеля». Ёсць такое шыкоўнае ў нашай мове слова — неруш. Вось майстар слова і паказаў чытачам неруш





роднае старонкі. Хай сабе камусьці апавяданне «Пеля» падаецца звычайным. На першы погляд яно такім і выглядае, у ім не адбываюцца маштабныя падзеі, няма варагуючых бакоў, цяжкіх характараў, нейкіх канфліктаў. І фабула нескладаная: хлопец, лепш сказаць — лірычны герой (гаворка ідзе ад першай асобы) пасля сесіі за першы курс інстытута «праз некалькі дзён павінен быў ехаць у сельгасатрад, у Крым, а пакуль сядзеў у сваёй вёсцы і нудзіўся»... І толькі калі надышоў дзень ад'езду (цягнік спыняўся на пару хвілінаў на станцыі ля самай вёскі), хлопцу зрабілася неяк настальгічна, сумна. Закарцела прайсціся па знаёмых мясцінах, а калі ўдасца, то і палавіць рыбкі. Часу хапіла б сабрацца, яшчэ і пачытаць да начнага цягніка. Але так не атрымалася. Балота, з яго карасямі, небяспечнымі мясцінамі, туманам, які насунуўся знянацку і надоўга, не адпусціла студэнта амаль да раніцы... І цягнік на Сімферопаль пайшоў без яго. А пасля выявілася, што ў Крыме аўтобус, у якім на другі дзень па прыездзе адправіліся аднакурснікі на вінаграднік, урэзаўся ў скалу...

Тут я ўжыву такую ўмоўнасць. У нас, у Беларусі, надта малая доля народа сярод насельніцтва. Народа, якому баліць душа за родную мову, культуру, за школу, страшна абруселую. Сярод насельніцтва, якому галоўнае — была б спажыва страўніку. Дык вось чытач-прадстаўнік насельніцтва можа проста ігнараваць беларускі твор, а тым болей — з такім незацяганым найменнем «Пеля». Зразумела, для самабытнага празаіка гэта не страта, што засведчылі яго развагі і пра «Смуту», і пра кнігу ўвогуле, і шмат пра што яшчэ ў звароце «Да магчымага чытача», асабліва — у яго заканчэнні.

Для мяне гэтае апавяданне дарагое. Усцешаны, што яно нашае, беларускае. Жыццёвае, праўдзівае (хай сабе аўтар кажа «выдумалася» за дзве гадзіны, гэта тым больш уражвае). У жыцці якраз такое здараецца: плануеш адно — атрымліваеш іншае, непрадказальнае. Яно і аптымістычнае: малады чалавек ацалеў паміж смяротнымі пагрозамі.

Федарэнкаўскае балота, ніколечкі не падобнае да мележаўскага, паціху высыхае. Але засталася пеля. Хлопец дабраўся да вады і зразумеў: «напароўся на неруш, дзе, можа, некалькі гадоў ніхто не рыбаліў. Карасі амаль не супраціўляліся». Аднак жа азарт ледзь не пагубіў яго: з купіны на ягоны астравок перапаўзала вялізная гадзюка. Выратавала, як ні дзіўна, міжвольнае глупства: ён тупнуў, і край астраўка, які і так ледзь ліпеў, у адзін міг адламаўся, і ён «наўзнач боўтнуўся ў чорную халодную прорву». Мокрымі пальцамі хапіўся за пук травы, за мяккі бераг, які адрываўся, бы гліна, але намацаўся і корань, па якім выкарабкаўся на свой корч. На юнаку вісела жабурынне, карэньчыкі, камякі гразі, з парэзаных пальцаў цякла кроў. А тут — новыя выпрабаванні, звязаныя з густым сівым туманам, які ўладна насунуўся на балота. «Толькі пад нагамі нешта можна было яшчэ разгледзець. Дарыбачыўся!..» Хлопец схапіў сетку з уловам — кілаграмаў восем — і злосна, рашуча ступіў на свой след, ды ізноў шахнуў па самыя пахі. Пад рукамі захадзіла ўжо знаёмая мяккая кашка... Словам, цэлы каскад прыгодаў паднесла роднае балота.

Апавяданне «Бляха» ў «Смуце» знаходзіцца як бы на супрацьлеглым полюсе ў параўнанні з «Пеляй», яны — палярныя. Толькі адно з іх — пра «вязучага» чалавека. Бляха — чалавек няшчасны. Ён быў рахманы, бяскрыўдлівы, за чарку ішоў на любую работу, але ў вёсцы яго здавён не любілі і асцерагаліся: п'яніца і злодзей. Жыў без бацькі, маці не слухаўся. Вучыўся абы-як. Скраў мапед і адсядзеў за гэта паўтара года. Пакуль сядзеў, маці памерла. «Толькі пасля Чарнобыля Бляха пазнаў, што і ён чалавек». Нямоглыя старыя, што засталіся на «зоне», клічуць, калі трэба забіць кабанчыка. Нават не па мянушцы называюць — успамінаюць сапраўднае імя. І пляшку ставяць. Аднак тут усё меней застаецца жывых ахвяраў чарнобыльскага ліхалецця: дзейнічае закон адсялення. Далей пісьменнік з уласцівым яму гранічна разняволеным пачуццём праўды разгортвае жахлівыя падзеі. Эйфарыя волі былога «цюрэмшчыка» нядоўгавечная, бо жменьцы людзей, што засталіся дажываць у небяспечнай зоне, не даюць спакою рабаўнікі. Асабліва ім пахне свежына. Далей у апавяданні адбываецца трагедыя; Андрэй Федарэнка паказвае сваіх герояў у экстрэмальных умовах, учынкі іх цяжка прадказаць нават да фабульнай развязкі.

...Завіруха, сцюжа, завыванне вятрыска. Цёмная ноч. Не паспелі гаспадары, дзед з бабай, і Бляха, разабраўшы кабана, толкам выпіць і смажанінай закусіць, як у двары з'явіліся здзічэлыя сабакі і злодзей. Няпрошаны госць пралазіць у калідор, забірае сцягно, рэбры, сала. Але ўсё неверагодна хутка мяняецца. Вось ужо злодзей з енкам пра дапамогу стукаецца ў хату да старых, ім жа толькі што абрабаваных. На яго напала гайня сабак — «на ім не было жывога месца». Бляха, які спачатку яго ўдарыў, пашкадаваў, што стукнуў хлопца (калі зразумеў, што ён самлеў), і захваляваўся: «Шкода ж, бляха, падлу маладую...»

Колішняга зняволенага пагубіла яго спагадлівае сэрца. Ён акунаецца ў халодны змрок, бяжыць па фельчарку і, наляцеўшы з гарачкі, з разгону на чорную звяругу, што грызла нешта пад веснічкамі, гіне, разарваны сабакамі... Я не здзівіўся, што «Бляху» апублікаваў нью-ёркскі «Ікарус», які, як паведаміў аўтару ў сваім лісце перакладчык Р. Завістовіч, увогуле не друкуе неамерыканскіх пісьменнікаў і ўсяго аднойчы зрабіў выключэнне — дзеля такога факта, як распад СССР.

Цешыць тое, што ў кнізе няма слабых ці прахадных твораў, нават небыліца «Камандзіроўка» цікавая, як і кароткае апавяданне «Рэдактар». А якое натуральнае апавяданне «Начны голас»! І якое маляўнічае «Адзін летні дзень»! Яно ж і сцэнічнае, гэтак жа, як аповесць «Сінія кветкі».

Пасля «Смуты» ў Федарэнкі з'явілася «Вёска», надрукаваная ў «Полымі» (1995), вельмі сімпатычная аповесць, якую і пасля Кузьмы Чорнага, Івана Буніна ды Антона Чэхава цікава чытаць. «Антона Васкевіча выгналі з інстытута...» — такі пачатак. Адлічылі з другога курса сталічнае ВНУ. І вось ён вяртаецца дадому. Маці і старэйшы брат-гараджанін хваравіта перажываюць сумную падзею, асабліва маці. Антон гэта прадбачыў, таму ў лісце да яе быў прыдумаў, што «давядзецца ўзяць акадэмічны на паўгода ці на год». Але па вёсцы пайша пагалоска, што Антона выгналі за п'янку. Маці хоча ведаць праўду. Сын тлумачыць: выгналі за тое, што гаварыў па-беларуску...

Неўзабаве Антон уладкаваўся на працу, акрыяў душою. Ён шчыры, старанны, сціплы і разважлівы, падабаецца дзяўчатам, у тым ліку школьніцы-сямікласніцы Наташы. У аповесці вельмі ўдала раскрываюцца характары: Антона, яго маці, некаторых вяскоўцаў, шмат помных апісанняў (напрыклад, як хлопец, былы атэіст, упершыню наведвае царкву). А завяршаецца гісторыя Васкевіча, як звычайна добрая казка, аптымістычна: яго ўзнаўляюць у інстытуце...

У сваёй творчасці Андрэй Федарэнка не абышоўся без гістарычнае тэмы. Але сваёй чуйнаю душою дакрануўся ён не да сівой старажытнасці — аповесць «Нічые» вядзе нашых сучаснікаў да трагічных для Беларусі падзей позняй восені 1920 года. Пра Слуцкую брыгаду, яе збройны чын, пра тое, што адбывалася цягам некалькіх дзён лістапада 1920 года ў Слуцку, Семежаве, іншых мясцінах Случчыны, пра лакальныя сутычкі беларускіх патрыётаў з чырвонымі, драматычныя лёсы неардынарных асобаў, а заадно і пра лакеяў рэжыму падаўлення распавядае пісьменнік у «Нічыіх».

Да не менш балючай тэмы дакрануўся Федарэнка ў «Афганскай шкатулцы». Праўдзівы мастак не мог не адлюстраваць вялікай бяды, што прынесла многім нашым армейцам і іх сем'ям афганская бойня, у якую ўцягнула нашыя войскі тадышняя Масква. Падзеі, што адбываюцца ў аповесці, звязаныя з афганскаю шкатулкай, перапраўленай некалі на тэрыторыю Беларусі і надзейна прыхаванаю. Важную ролю адыгрываюць падлеткі; яны высочваюць злачынцаў і дапамагаюць следчым вызваліць з-пад турэмнага арышту галоўнага героя аповесці Барыса Крушынскага, які, у сваю чаргу, дзякуючы каштоўнасцям з чужой краіны, ратуе дзяўчынку, што апынулася ў бядзе, галечы і адчаі. Тут, як і звычайна ў творах Федарэнкі, дзейнічае гуманістычны складнік, таму спагада і дапамога людзям, якія ў бядзе, — якасць, дамінуючая ў характарах розных персанажаў аповесці.

У «Афганскай шкатулцы» ёсць і такі незвычайны твор — «Цугцванг». Такім словам нямецкага паходжання прынята называць становішча ў шахматнай партыі, калі аднаму з гульцоў невыгодна рабіць ход, бо ён вядзе да паражэння. Андрэй Федарэнка — выдатны шахматыст. Дзякуючы яму ў беларускай літаратуры з'явілася гэтая кароткая аповесць, дзе скарыстаны не толькі шахматны тэрмін, а і правілы гульні, больш за тое: задача-двуххадоўка, складзеная адным шахматыстам, дае разгадку другому, дзе схаваны залаты скарб. Праўда, разгадка прыпазнілася, і скарб дастаўся выпадковым людзям.

Федарэнка «дагадзіў» школьнікам і прыгодніцкай аповесцю «Шчарбаты талер». Ён прыдумаў прыгодніцкую гісторыю пра тое, як дзеці захопленыя пошукам скарбу, схаванага французскім афіцэрам у 1812 годзе. І галоўная інтрыга ў тым, што французскі вайсковец выбраў для шыфроўкі скарбу незнаёмую яму беларускую мову. «Гэта мо сотая мая спроба тым ці іншым чынам калі і не зацікавіць беларуса роднай мовай, дык хоць прымусіць звярнуць на яе больш пільную ўвагу», — сказаў пісьменнік у дыялогу з Вольгай Барабаншчыкавай. Зацікавіць свядомых беларускіх чытачоў ён умее не толькі вострымі сюжэтамі і надзённымі праблемамі, ён яшчэ заахвочвае падлеткаў да беларускасці. На старонках прозы Федарэнкі беларускае ўсё: і героі, і прырода, і мясціны, дзе разгортваюцца падзеі.


Як вядома, паводле гэтай аповесці зняты чатырохсерыйны фільм «Тры талеры». Я так парадаваўся, што родная кінастудыя заўважыла цікавы прыгодніцкі твор! (У фільме, між іншым, займеў ролю і мой унук Алесь!). А пасля засмуціўся, бо даведаўся, што аўтар займальнай аповесці і сцэнара «Трох талераў» ні капеечкі аўтарскага ганарару не атрымаў. Думаю, яго падвяла даверлівасць. Мабыць, падпісаў дамову не чытаючы: не думаў, што так лёгка дзяржаўныя чыноўнікі яго ашукаюць...

Напрыканцы 2018 года выйшла новая кніга Андрэя Федарэнкі «Сузіральнік», папоўніўшы бібліятэчку часопіса «Дзеяслоў» (выпуск 25). Сюды ўвайшлі аповесці «Ксю» і «Сузіральнік», апавяданні «Сахалінка» і «Шчасце», эсэ «Манголія» і «Пташнікаў». Уся проза дасканалая. Ды пра яе — гаворка асобная...

Першы раз у жыцці выказваю шкадаванне, што я не крытык. Калі б крытыка была маёй стыхіяй, я паказаў бы ўсю красу і сілу прозы Андрэя Федарэнкі, яго бліскучае майстэрства, кампазіцыйную вытанчанасць, разняволеную раскошу яго мовы, тое, як пісьменнік удала сумяшчае сваё моўнае багацце з народнымі залацінкамі, чысціню літаратурнае мовы з размаітасцю палескага дыялекту, элементамі трасянкі, і тое, які ён памяткі, як ведае класіку, і што думае пра неасцярожнае абыходжанне са словам і пра кашчунны гумар... Словам, я распавёў бы пра высокадухоўную асобу творцы, які, дзякуй Богу, верыць свайму густу ды ідзе сваёй дарогаю.

Васіль Жуковіч

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 5 (153) | 31 траўня 2019 | № 20 (631) Новы Час



Сяргей ПАНІЗЬНІК

Жыцця кругі

Стваральнікі Памяці

*Паэты сардэчныя
жывуць без гарантыі, —
але — невылечныя,
але — не парадныя.*

*Змушалі кармушкамі
ісці ў гладыятары...
Паэты не гушкалкі —
кіпучыя кратэры.*

*Смуродныя сталіны
мясілі сякерамі.
Адметныя таленты
знішчалі з паперамі...*

*Паэты не нулікі.
На трон не нахільныя.
...Глядзім на іх воблікі
ужо надмагільныя, —*

*са славаю свечнаю,
судзьбінаю грознаю:
гараць словы вечныя
любоўю запознаю.*

* * *

*А мы не на паперці, —
паэты бяседныя.
Ахоўнікі Памяці —
у ёй і аседлыя.*

*Мы — Нацыі лечыва.
І рыфмай зыбучаю
калышам спрадвечную
Айчыну пявучую...*

25.10.2017

Водсвет, які сэрца гоіць

***Берагу майго зарніцы,
водсьвет ваш мне сэрца гоіць,
не дае стаць чужаніцай
у змаганьні за сьвятое.***

(Эпіграф Янкі Запрудніка да кнігі пра служэнне Беларусі — «Берагу майго зарніцы», 2017.)

*1.
Стромкіх думаў берагі
і узнёсласці зарніцы!
Вашым водсветам гаіцца
будзе век мой дарагі.*

*2.
У змаганні — сэрца-крыца:
знікне хмара-чужаніца
за нажытыя лугі.*

*3.
Там хачу зноў памаліцца,
дзе быў лёс украніцца
з-пад вясёлкавай дугі.*

* * *

*Важкія ў жыцця кругі, —
ды змагу за ўсе даўгі
я на свята Касавіцы
толькі Богу
пакарыцца.*

18.XI. 2017

Вішні цвітуць!

Перакладчыцы-ластавачцы Даяне Лазарэвіч — вялікая падзяка за паэтычнае спарадненне сербска-беларускага мацерыка.

*Расквітнелі вішні!
Я цяпер не лішні
ў садзе маладым.
Бог — Стваральнік Весні —
ластавачцы ў песні
перадаў уздым.*

*А Даяна з высі
свае думкі-мыслі
мне перадала:
— Вось фінал супрацы!
— Буду й я старацца...
Выдаўцам — хвала!*

*Радуйся, Скарына,
Сербіі гасціннай:
зборнік — гэта кліч.*

*З вішняй у Бялградзе
ля Даяны ў садзе —
беларус-крывіч.*

14.03.2019

Настырнае стырно Дзвіны

Ад прыдзвінскіх румаў вялі стырнавыя свае плыты-ганкі да балтыйскіх берагоў. І паэты моцна трымаюцца вясла-руля на вірах паэзіі.

*Збліжаем далягляды,
злучаем рытмы сэрцаў.
Мы вечаруем святы —
сустрэчы спадкаемцаў.
Еўропа там, дзе мы.
І Беларусь — Еўропа.
Купальскія дымы
плывуць да расцяроба:
з Каўчэгавай кармы
вітае нас Еўропа.*

*Праз межы і стагоддзі
жывое слова кліча, —
і свеціцца ў лагодзе
сяброўскае аблічча.*

*Каўчэгу не спыніцца.
Не будзе развітання.
Сам Полацак — сталіца
натхнёнага кахання!
Еўропа там, дзе мы.
І Беларусь — Еўропа.*

*Стырно — струна сурмы.
Дзвіна — вякоў аздоба!*

2000, 2019

У нажытак

Спадарыні Вользе Грыцук (Дуброўскай), суайчынніцы з г. Дзісна

*Кляновы ліст падняў далоньку.
Удзячная мая рука:
вясёлай восені старонку
чытаю з першага радка.*

*Клён, як і я, натхнёны Маем, —
і ў лістапад мы не гуляем,
пра-жы-лач-ка-мі супадаем!*

*Не дзіва: зроду сваякі.
І наш нажытак ля ракі
кладзецца ў Летапіс. Радкі
шыфруе вечар гаваркі.
Іх на дабрыдзень пакідаем.
Зімой сябе перачытаем
і — у пупышцы — адпачнем.*

*Прабʼецца ліст...
Сцяг — утрымаем!
З яго і Сакавік пачнем.* **2011**

І здзейсніца Дзісна!

***«Мая радзіма — Дзісеншчына... І не магу зразумець тых, хто лёгка забываецца на сваю зямлю, сваю родную мову, на ўсё, што робіць чалавека чалавекам...»
Вольга Грыцук з дому Дуброўскіх***

*Жыла ў Дзісне з Дуброўскімі, Ластоўскімі,
там чула Жаўняровіча псалмы...*



*Дасюль Дзісна ні крыгамі, ні войскамі
не змецена: тут Адзігітрыя і мы.*

*Да Друі, да Лявонпаля, да Браслава
схіляюцца чупрыны курганоў.
І сёння ёй, Васільеўне, прыўкраснага
тут вельмі многа для паромаў-сноў.*

*Дарожкаўскую вуліцу з каштанамі,
муры, капліцу помніла дзяўчо...
...Пранесліся нягоды — ураганамі
і пад спадзеў падстаўлена плячо.*

*Каханейка пякучае не стоміцца
збіраць сляды дзяцінства ля Дзвіны...*

*Ёй здзейсніца Дзісна! Вярба памоліцца,
каб наша суайчынніца-патомніца
прыйшла на фэст пад родныя званы.*

6 верасня 2013

На звеставанне

Хрысціне Лялько

*Зіма з вясною напалам —
Гуканне не для ўлову.
Атожылак вясенні! Нам
дапамажы маліцца Слову.*

*Сцяжына з гурбай на палях
падзеліць і надзею.
А для Кахання трэба — Шлях:
ідзе Любоў — я маладзею.*

*Наўкруг паменее ўдвая
і штурханіны ўзбочнай,
калі паўстанем Ты і Я
Вялікаднем
над Усяночнай.*

У падмацунак

З нагоды задумы Міколы Купавы на аднаўленне Аршанскага помніка

*На віленскім барока
уселася сарока:
руінаў тут — валока,
на дзесяціну — друз.
А мы такія людзі:
калі дзе ёсць — не будзе!
Пры алтары, ў арудзе
знішчаем «панскі» груз.
Ці ж родным быў той Рурык,
ды нейкі хан-прыдурак?
Нам янычарскі турак
не ўсеўся на каршэнь.
Сваёй гадоўлі зграі
некропалі раскралі,
святыні зааралі...
У нас вякі — мішэнь.
— Падумаеш: без даху
той кляштар. Знялі бляху —
і базыльяну-ляху
з амбона не гудзець!..
— Без даху ты, удзыху,
начальнічак. Скінь пыху,
зірні на Воршу, Быхаў...
Дзяржава — не павець!
Ты ёй паслужыш? Доўга?
Мо зноў пазваць Міндоўга,
каб ён таму даў поўху,
хто беларус ледзь-ледзь.
І пасаліў у клець, —
хоць клеці ацалець.*

28.04. 2013

І хто ў аблудзе?

Антону Астаповічу — ахоўніку помнікаў гісторыі і культуры

*«Свет гвалтаў, здзекаў...» да падмуркаў
разбураны! Каля палаца
стаім за лагерных прыдуркаў:
не ацалела продкаў праца...
Спаўзае вежа пад падэшвы,
лёг камень з могілак — пад ганак.
Дзядуля прашаптаў: «Ох, бэшлы,
атручаныя без паганак...»*

* * *

*А хто свінарнікамі цешыў
шчаслівых землякоў Шагала?
Там рошчына з калгаснай дзежы
дыхоцце наша абражала.*

* * *

*Цяпер мы тут — усе — ў аблудзе?
Няўжо хто праўдалюб, той злыдзень?
Мне не спадобна жыць у хлудзе,
Таму й крычу: — Хай сонца ўзыйдзе!
З падмурка выскачыць да крокваў,
пакажа промнікам-галінкай:
— Да будучыні — дваццаць крокаў.
І даўніна вунь — пад цаглінкай.*

16. 07. 2013

З бухты Барахты

***Сяргейка, — пяць! —
Не ад віна
Табе я стаўлю бал такі.
Нам родная з табой Дзвіна —
Уся твая да Балтыкі!***

Аўтограф Рыгора Барадуліна на яго зборніку «Рум». Жнівень, 1974 год.

*Я з бухты Барахты.
Там Гонар без вахты,
без ветразя шляхты
прапаў і Статут...*

*Чаго сёння варты Дзяржавы рэдут?
Мо э-лек-та-рат — неагучаны Люд:
Тутэйшы стаў Тамашнім?
Не! З бухты Барахты выскокваю Ранішнім!*

*Зноў круцяць варштаты мае дэпутаты;
а вунь дэмакраты ладуюць фрэгаты...
Са спратаў нарэшце паўстаў Беларус.
Пачуўшы набат, абнаўляе свой курс.*

*Руплівец, аценьвае матрыярхаты,
бо ў бухце Барахты астыла стырно
і выхаду ў мора амаль не відно...*

*Ды не! Брыганціна, віціна і струг
з каўчэгам і лайбай збіраюцца ў круг.*

*Напоўніцца з бухты Барахты
мой трум:
сам бераг Дзвіны — вечнай памяці РУМ.*

13. 03. 2019

Цагліна з імем Леніна



Барыс ПЯТРОВІЧ

— Над чым працуеш? — галоўны рэдактар уляцеў у кабінет імкліва, як метэор. Максім не паспеў нават схаваць кнігу, якую чытаў пад сталом на каленях. На гэтае заўсёды раптоўнае ўварванне і пытанне рэдактара ва ўсіх супрацоўнікаў быў загадзя падрыхтаваны адказ — нешта кшталту: адпісваюся за камандзіроўку, вычытваю карэктуру ці яшчэ штосьці падобнае. Рэдактар дужа не любіў паўзаў перад адказам і за дробную затрымку мог узарвацца імгненна: гульма гуляеце, інтарэсы газеты вам да задніцы, аднаму мне ўсё трэба…

У Максіма таксама на такі выпадак была падрыхтаваная адгаворка, але гэтым разам ён разгубіўся і ляпнуў тое, што лічылася жартам для сваіх, але не для рэдактара:

— Над сабой…

— Што? Як? Над сабой? — рэдактар перагнуўся і зірнуў за стол. «Капец, — падумаў Максім, — істэрыка і разборкі забяспечаныя». — А-а-а… — рэдактар усміхнуўся, — чытаеш… Таксама трэба. Развівайся. Расці!.. Але — зайдзі да мяне потым. Размова ёсць, — падміргнуў і борздзенька выбег з кабінета.

Гэта было зусім не падобна на яго. Не тое, што заскочыў у кабінет без стуку, адным махам расчыніўшы дзверы — так рабіў ён кожны раз, калі з'яўляўся ў рэдакцыі. Любіў заспець журналістаў знянацку, каб прысароміць, што марнуюць рабочы час, «адчытаць» і тым падкрэсліць сваю значнасць. Нечаканым было тое, што рэдактар не завёўся імгненна, не зароў на Максіма, не стаў ірваць і таптаць кніжку, як бывала не раз, а ледзь не па галоўцы пагладзіў: «Расці…», і запрасіў да сябе. Такога раней не было. Што б гэта магло значыць?

Максім адклаў кнігу і не ведаў, што рабіць. За такія нечаканыя наскокі ў кабінеты рэдактара называлі жыўчыкам, што ў перакладзе на рускую мову гучала б не дужа прыстойна, а па-беларуску дык нібыта і прыгожа — падкрэслівала ягоную «жывасць». Быў рэдактар невысокі, кругленькі, з добра заўважным ужо жывоцікам, і на сваіх кароткіх нагах каціўся па калідоры рэдакцыі бы калабок, раз-пораз зазіраючы ў кабінеты. З розных куткоў толькі і гучала: «Над чым працуеш? Ага…» — і голас то аддаляўся, то набліжаўся. Аж пакуль з аднаго з кабінетаў не чуўся ягоны віск: «Што? У шахматы гуляеце? У рабочы час!..» — не паспелі хлопцы прыбраць дошку са стала, загуляліся і не пачулі набліжэнне рэдактара. Усё. Рэдактарскі дзень прайшоў не дарэмна… А хлопцам увечары давядзецца лячыць нервы ў бліжэйшай кавярні-забягайлаўцы…

Гэткія раптоўныя рэйды па кабінетах у рэдактара называліся працай, бо ўвесь астатні час газету рабілі намеснікі, а ён днямі быў «у абкоме» і толькі перыядычна пазвоньваў, перапытваў, як справы, казаў: «Буду», — і не прыязджаў. Гэта так называлася «ў абкоме», а дзе і з кім ён быў насамрэч, ведала ўся рэдакцыя — у журналісцкім доме адпачынку на беразе рэчкі, які лічыўся ўсіхнім, а быў выключна ягоным.

Паход да рэдактара не варта было адкладваць. Не кожны раз ён да сябе запрашае ды яшчэ з таемным падміргваннем… Але чаму рэдактар так спакойна ўспрыняў ягонае чытанне ў рабочы час? Адклаў разборку ці за гэтай ягонай абыякавасцю хаваецца нешта важнае? Максім прыкінуў, ці не адбываецца дзе нейкі высокі семінар? Не, здаецца, на апошняй планёрцы размовы пра тое не было. Што ж тады? Максім вычакаў яшчэ пару хвілінаў і пайшоў да рэдактара, як ідуць на крыж — непазбежны і немінучы.

Рэдактар і сапраўды быў у гуморы. У прыёмнай ён нешта вясёлае казаў сакратарцы Тацяне, лёгенька прыабдымаючы яе за даволі шырокую талію, чаго ніколі не рабіў, бо сакратарка была жонкаю ягонага кіроўцы. Руку не адняў нават калі зайшоў Максім. Толькі кіўнуў: праходзь — і паказаў вачыма на дзверы ў кабінет.

— Такая справа, — пачуў Максім за спіной голас рэдактара, яшчэ не паспеўшы толкам увайсці, — у маёй жонкі паслязаўтра дзень нараджэння, і яна захацела здзівіць гасцей сваім фірмовым блюдам — фаршыраванай рыбай. А цяпер, бачыш, не сезон на карпа і шчупака. У горадзе не дастаць, — прайшоўся па кабінеце ўзад-уперад так хутка, што цяжкія шторы на вокнах узняліся ўслед за ім, а потым павольна апусціліся. — Дык будзе табе асабістае заданне: адскоч у саўгас «Ленінскі», дзе рыбку вырошчваюць. З дырэктарам я ўжо дамовіўся — ён чакае. Заўтра раненька мой Валодзя заедзе па цябе — да вечара вернецеся… Ну а каб не дарэмна — вазьмі там які добры матэрыял. Каб аддзячыць і… і… ну сам разумееш… Камандзіроўку Таня выпісала — забяры.

Часы ўжо былі перабудоўчыя, але жылі яшчэ зусім свежыя ўспаміны пра андропаўскую дысцыпліну. І Максім зразумеў, што пасылаюць па рыбку не аднаго шафёра, а і яго, нібыта па матэрыял, «каб аддзячыць», рэдактар на ўсялякі выпадак проста перастрахоўваецца.

Дарога ў саўгас, хоць гэта і больш за дзвесце кіламетраў з аднаго краю вобласці да другога, на дзіва амаль не сцяглася. Адкінуўшыся ў наседжаным рэдактарам мяккім крэсле, Максім спачатку незаўважна для сябе драмануў, а калі ачуўся, ледзь не палова шляху была ўжо ззаду. Ранкам машынаў было няшмат, і Валодзя-кіроўца гнаў рэдактарскую чорную «Волгу» так, што толькі мільгалі дрэвы ды вёскі. Даішнікаў ён не баяўся — машыну з абкамаўскімі нумарамі ніхто не адважыўся б спыніць. Да маладога супрацоўніка Валодзя паставіўся прыхільна, па-прыяцельску. Хоць шафёр шэфа ў рэдакцыі — гэта пасада больш значная за любога загадчыка аддзела, а то і яшчэ вышэй браць трэба. Бо ён ведае ўсе сакрэты таго, каго возіць, і не толькі.

Ехалі ў саўгас, звязаны з імем Леніна, і Валодзя пачаў са смехам распавядаць, як падчас апошняй паездкі ў Маскву сябар ягоны хацеў зацягнуць яго на экскурсію ў знакаміты маўзалей: «Ну як так: пабыць у Маскве і не пабачыць Леніна?»

— А што мне з таго Леніна? Я нарэшце без руля — на цягніку прыехаў. Мне б пачарніліць. Тым болей у сябра запасы дай божа! Ён на складзе працуе, без талонаў усё бярэ. Кажу яму — хай жонкі ідуць, а мне нецікава: што глядзець, як там фіш фаршыраваны на блюдзе ляжыць — гэта я нядаўна такое параўнанне ў адной газетцы прыбалтыйскай вычытаў. Шэф у машыне на сядзенні пакінуў. Ну і вырашыў казырнуць. Што тут па-ча-ло-ся! Як узвілася сябрава жонка — яна ідэйная, аказваецца, — як ты можаш такое казаць, я думала, ты сур'ёзны чалавек, не абы каго возіш!.. Ледзь з хаты не выгнала. Во, думаю, папаў дык папаў. І хто мяне за язык цягнуў пра той фіш плявузгаць. Ледзь супакоілі яе…

Валодзя расказваў пра сваю прыгоду і рагатаў на ўсю кабіну, ажно слёзы выступілі. Змахнуў іх правай рукой і лёгенька крутнуў руль. На хуткасці машына вільнула і выскачыла на сустрэчную, па якой якраз нёсся грузавічок. Машыны размінуліся, ледзь не чыркнуўшы адна адну. Максім уціснуўся ў крэсла, падцяўшы ногі і заплюшчыўшы вочы… Уф-ф, пранесла.

Рукі Валодзі на рулі лёгенька падрыгвалі.

— І трэба ж было мне ўзгадаць пра гэты фі… Вось ужо — лепш не чапаць га… — ён нервова пахітаў галавой, — да-а-а-а… Цьфу, цьфу, цьфу…

Далей ехалі моўчкі.

Калі пакрысе прайшла дрыготка ад нядаўняга здарэння, Максім злавіў сябе на думцы, што Валодзя сёння яго ўжо двойчы здзівіў. Па-першае, не столькі сваім расповедам пра Леніна, колькі стаўленнем да яго. Па жыцці Максім больш кантактаваў з так званай інтэлігенцыяй, і падобныя адносіны да «правадыра рэвалюцыі» і ягоных «паплечнікаў» ажно да цяперашніх сярод іх не былі нечым выключным. Кухонныя размовы густа перасыпаліся анекдотамі. Але ж то інтэлігенцыя — г…но нацыі, як казаў той самы правадыр. А каб просты шафёр так ставіўся… Зрэшты, нічога ў тым незвычайнага не было. Сістэма прагніла наскрозь — гэта разумелі многія, і яна даўно ўжо не здольная абараніць саму сябе і перасадзіць па турмах усіх дысідэнствуючых ці проста тых, хто адкрыта пасмейваецца з нягеглага кіраўніцтва, асабліва пасля пяцігодкі пахаванняў, калі адзін за адным пайшлі з жыцця Брэжнеў, Андропаў, Чарненка. А таму размовы з кухняў перайшлі ўжо і ў курылкі гегемонаў — рабочых ды сялян… Максім згадаў, як у будатрадзе яшчэ пры Брэжневе яны працавалі разам з мясцовымі будаўнікамі, і сярод муляраў быў адзін, якога звалі Леанід Ільіч. Рабочыя ўвесь час жартавалі, нібыта цытуючы яго, а падразумяваючы вядома каго: «Як сказаў наш дарагі Леанід Ільіч, пара ісці на абед…» ці «Як гаворыць наш дарагі Леанід Ільіч, варта ўзяць па чарцы»… Рогат пры гэтым стаяў несусветны. І не менш за іншых смяяўся сам Леанід Ільіч. Другое, што ўразіла Максіма ў паводзінах Валодзі — ягоная раптоўная прымхлівасць пасля здарэння. Была яна падобная да апраўдання. Нібыта ягоны расповед ледзь не стаў прычынай аварыі. Але хто сказаў, што Валодзя просты шафёр? Ён зусім не просты, а шафёр шэфа. Выпадковых туды не бяруць. Нездарма ў рэдакцыі хадзілі размовы, што ён пастуквае куды трэба. Значыць, расказваў наўмысна. Правяраў маладога?.. Не, здаецца, ён гаварыў шчыра, не акцёр жа, каб так прытварацца…

Думкі Максіма перапыніў Валодзя.

— Не без прыгодаў, але даехалі, — з палёгкай уздыхнуў ён, паварочваючы на ўказальнік з назвай вёскі — цэнтральнай сядзібы саўгаса. І назва гэтая — Ленін, ніколькі не здзівіла Максіма. Не проста не здзівіла, а падалася нават больш заканамернай, чым якія-небудзь Мышкавічы пры ўездзе ў калгас імя Леніна. Вёска Ленін і саўгас «Ленінскі». Усё лагічна. А вось пасярэбраны бюст Ільіча каля канторы саўгаса ўразіў сваёй непадобнасцю да правадыра пралетарыята і нейкай нягеглай, карыкатурнай непрапарцыйнасцю. Пра тое, што гэта Ленін, можна было толькі здагадвацца па адметнасцях, якія заўсёды прысутнічаюць у такіх выпадках: буйной лысіне зверху, раскосых вачах і трохкутнай бародцы знізу.

Дырэктар саўгаса, мажны, чыста паголены мужчына з густымі жорсткімі, як шчэць, кароткімі чорнымі валасамі, што складкамі ляжалі на тлустым карку, доўга прабачаўся, бо не паспеў яшчэ «падрыхтаваць мяшэчак рыбы па просьбе Пракопавіча». Але адразу ж супакоіў: да палудня ўсё абавязкова будзе. А цяпер ці не прайсці ім у сталоўку і перакусіць з дарогі. Сняданак жа. Максім адмовіўся, есці не хацелася, і ён вырашыў выкарыстаць вольны час на тое, каб папрацаваць.

— Я маю ад Пракопавіча спецзаданне — напісаць па вашай падказцы што-небудзь прыгожае з саўгаса — разумнае, добрае, вечнае… Толькі, — Максім перапыніў памкненне дырэктара загаварыць, — не райце мне перадавую даярку. Гэтыя надоі ў мяне ўжо вось дзе сядзяць, — чыркануў па горле.

— Ну дык цудоўна! Цудоўненька, — абрадаваўся дырэктар, — вы ўпершыню ў нас? Ага. Дык вам пашанцавала — будзе сенсацыйны матэрыял. Абяцаю.


Радасць дырэктара Максіму была зразумелай. Хваліцца яму, дакладна, не было чым. Што ў рыбагадоўлі, што ў жывёлагадоўлі. Паказчыкі ў ягонай гаспадарцы былі значна ніжэйшыя за сярэднія па раёну. Максім не паспеў толкам пабачыць вёску, але можна было не сумнявацца, што наўрад ці і яна была ўзорам ідэальнай сацыяльнай упарадкаванасці. Яму чамусьці прыгадалася нядаўна бачаная па тэлевізары сустрэча ў Астанкіне са знакамітым расейскім кінарэжысёрам. Той расказаў, як хацеў зняць фільм пра вёску пачатку дваццатага стагоддзя, каб была з саламянымі стрэхамі і без асфальту.



Працяг на стар. 12 (6) »

Цагліна з імем Леніна

« Заканчэнне.
Пачатак на стар. 11 (5)


Фота www.gorodche.ru

Пасля вайны, калі мястэчка нашае наперакор усяму адрадзілася, пачалі называць яго ўжо не Ленін, а на рускі манер Ле-ни-но. Ад Леніна, маўляў. І мне ніхто не верыў, што мястэчка нашае называлася Ленін яшчэ задоўга да рэвалюцыі — мне бацька мой пра тое расказваў і іншыя старыя людзі

Спытаў у кіраўніка аднаго ў падмаскоўных абкамаў, куды б варта яму паехаць. «Няма праблемы, — абрадаваўся сакратар, — едзьце хоць у калгас «Запаветы Ільіча», хоць у «Ленінскі шлях» ці ў «Шлях да камунізму» — і будзе вам пачатак стагоддзя без асфальту і з саламянымі стрэхамі...» Рэжысёр адкрыта намякаў, што семдзесят гадоў савецкай улады для вяскоўцаў пайшлі ў пясок...

Але — што там за сенсацыю абяцае дырэктар? Максім прыслухаўся.

— ...А мясціны нашыя, скажу я вам, дужа цікавыя, — казаў дырэктар. — Шкада, што ваш брат журналіст пытае звычайна пра цэнтнеры ды прывагі. І зусім ніхто не цікавіцца краязнаўствам. А нам ёсць чым пахваліцца.

— Што вы кажаце? — Максім паказаў здзіўленне на твары, ад чаго дырэктар яшчэ больш расквітнеў.

— Вось вы, я ўпэўнены, абсалютна ўпэўнены, — дырэктар падняў указальны палец і патрос ім, — думаеце, што калі наш саўгас «Ленінскі» і вёска Ленін, дык назву сваю яны маюць у гонар Леніна.

— Ну так, адназначна, — Максім кіўнуў, пагаджаючыся, бо ні на хвілю не сумняваўся ў гэтым.

— А на самой справе вёска нашая называецца Ленін ажно з шаснаццатага стагоддзя! А Леніна тады яшчэ, як вы ведаеце, і ў праекце не было... — Пасмакаваўшы здзіўленне, што застыла на тварах Максіма і Валодзі, дырэктар працягнуў: — А яшчэ ў нас ужо шмат гадоў існуе музей Леніна, адзіны такі не тое што ў вобласці, а і ў рэспубліцы. Так, так! І ніхто ніколі пра яго не пісаў... Бюст Леніна бачылі? Яго зрабіў скульптар-самавук яшчэ да вайны. Перад акупацыяй яго схавалі, закапалі, а потым знайшлі і зноў паставілі... Але што я буду вам тут лекцыі чытаць. У нас для гэтага ёсць спецыяльны чалавек — школьны настаўнік гісторыі, які і стварыў музей. Я вас зараз з ім пазнаёмлю. Зараз... — падняў тэлефонную слухаўку, набраў нумар.

— Алё, школа? А Павел Паўлавіч дзе цяпер? На ўроку? Няхай заканчвае і мігам да мяне ў кантору. Журналіст з вобласці да яго прыехаў. Ага, з вобласці. Да яго. Давай, Уладзіміраўна, скажы Паўлавічу: адна нага там, другая тут.

Паклаў слухаўку і зірнуў на Максіма з выглядам пераможцы, маўляў, сам хутка пераканаешся ва ўсім.

Павел Паўлавіч прыйшоў хвілінаў праз дзесяць. Крыху запыхаўшыся, ён стаў у парозе з немым пытаннем: выклікалі? Невысокі, хударлявы, крыху згорблены, са звычайнымі рысамі твару доўгагадовага школьнага настаўніка, стомленага працай і жыццём. Жывымі і рухавымі былі толькі вочы, у якіх чыталася зацятая ўпартасць. Пра гэта казала цяпер і ўся ягоная пастава: нібыта і нерашучы ў прысутнасці начальства, але з відавочным ганарцом чалавека, які ведае сабе кошт. Дырэктар стаяў якраз спінай да дзвярэй і яго не бачыў, адчайна жэстыкулюючы, распавядаў Валодзю і Максіму пра апошні паход на паляванне:

— ...гляджу — стаіць, прынюхваецца, і нібыта пачуў нешта ды збіраецца развярнуцца і рвануць назад. А далекавата, бля... Але куды дзявацца, я прыцэліўся і бах! — ён падскочыў, перавярнуўся ў палёце і бац на спіну, аж зямля пад нагамі маімі задрыжэла. Ну, думаю, гатоў. Падыходжу — асцярожненька — не першы ж раз на паляванні, ведаю, як бывае, звер як-ніяк. Нахіляюся над ім — кроў з раны цурачком пульсуе. Радуюся: добра пацэліў... І тут ён пераварочваецца і як скочыць, бля... Метраў на пяць убок. Сэрца маё ў пяткі, я так і сеў, як стаяў. І, не паверыце, абма...

— Кхе-кхе... — кашлянуў Павел Паўлавіч. Дырэктар азірнуўся:

— О, Паўлавіч, а мы цябе чакаем, і я тут байкі баю, пакуль ты ідзеш... — павярнуўся да Максіма: — Потым дараскажу, вось, знаёмцеся, наш герой. Даследчык, так сказаць, таго, што было і пра што мы забыліся. Як казаў Маякоўскі, капаецца ў нашым акамянелым... гм... ага... мінулым. І шмат накапаў! Шма-ат!

Максім ішоў з Паўлам Паўлавічам па мястэчку — так, гэта было мястэчка, а не вёска — і адзначаў для сябе, што гэты мітуслівы і неспакойны, трохі пакамечаны жыццём і настолькі апантаны сваёй справай і засяроджаны на сваім чалавек, што яго можна было б, не ведаючы, прыняць за, мякка кажучы, ненармальнага, карыстаецца тут вялікай павагай. Сустрэчныя прыязна ўсміхаліся яму, мужчыны ціснулі руку, жанчыны ветла ківалі і прымружваліся, а дзеці яшчэ здалёк выгуквалі сваё «Здрасце!» І бачылася, што павага гэтая не толькі таму, што ён настаўнік. Ісці ад канторы да музея было недалёка, але людзей у даволі ранні час было надзіва шмат. Мо таму, што ішлі яны па самым цэнтры мястэчка. Усю дарогу Павел Паўлавіч бесперапынна расказваў пра музей. Максім зразумеў, што мітуслівасць ягоная і задышлівая хуткагаворка цяперашняя ад таго, што хацелася як мага больш распавесці журналісту пра тое, што стала сэнсам ягонага жыцця. І за што ён доўгія гады змагаўся. Так, змагаўся.

— Якая кароткая, аказваецца, у людзей памяць! Як хутка ўсё забываецца... Вы не паверыце, колькі часу і сілаў мне давялося патраціць на тое, каб даказаць, што нашае мястэчка сваю назву атрымала не ад Уладзіміра Ільіча. А так думалі ўсе тут і асабліва начальства! Што начальства — яно пасля вайны памянялася ў нас сем разоў. Але людзі! Хоць і тут няма чаго здзіўляцца. У час вайны мястэчка было спаленае. А большасць жыхароў — у асноўным гэта былі габрэі, ляжаць цяпер у брацкай магіле. Вунь там, на ўскраіне. Калі захочаце, сходзім туды. Фашысты ў адзін дзень расстралялі, знішчылі некалькі тысяч людзей, вінаватых толькі ў тым, што яны габрэі... І пасля вайны, калі мястэчка нашае наперакор усяму адрадзілася, пачалі называць яго ўжо не Ленін, а на рускі манер Ле-ни-но. Ад Леніна, маўляў. І мне ніхто не верыў, што мястэчка нашае называлася Ленін яшчэ задоўга да рэвалюцыі — мне бацька мой пра тое расказваў і іншыя старыя людзі. І толькі калі мы са школьнікамі раскапалі адзін падмурак і знайшлі дарэвалюцыйную цагліну, на якой было выбіта прозвішча гаспадара цагельні і месца вырабу — менавіта нашае мястэчка Ленін — удалося пераканаць няверачых, і тое не ўсіх, што назва нашая звязана не з Леніным, а наадварот...

Што азначала гэтае «наадварот», Максім даведаўся ўжо ў музеі — знешне звычайнай вясковай драўлянай хаце, але без сенцаў ці веранды. Таму ўваход быў проста дзвярыма ў сцяне над невысокім ганкам. Музей увесь, усцяж, уздоўж сценаў і пасярод, быў застаўлены шафамі і паліцамі з кнігамі... Максім прыгледзеўся: кнігамі Леніна на розных мовах, і з-за гэтага іншых экспанатаў адразу і не бачна было. Тут былі тысячы — тысячы кніг. Выключна твораў Уладзіміра Ільіча. Не менш як на сотні моваў свету, а можа, і больш, дасланых у гэтае палескае мястэчка на просьбу Паўла Паўлавіча. А таксама кнігі і зборы твораў Леніна, што выдаваліся ва ўсіх рэспубліках Савецкага Саюза па некалькі разоў у розныя гады і ў такзваных краінах сацыялістычнай дэмакратыі. Вочы разбягаліся ад рабаціння вокладак і карэньчыкаў розных адценняў чырвонага колеру і разнастайных партрэтаў правадыра з в'етнамскім, карэйскім, кітайскім прышчурам, з афрыканскім шырокім носам і пухлымі вуснамі, з выцягнутым еўрапейскім тварам і паўкруглым лацінаамерыканскім...

— Вось гэта і ёсць плён майго жыцця, — з гонарам, у якім чуліся і ноткі суму, сказаў Павел Паўлавіч. — У вёсцы Ленін павінен быць музей Леніна. Павінен хоць бы таму, што псеўданім свой ён узяў не пасля Ленскага расстрэлу ў памяць пра забітых, як пішуць у партыйных даведніках і вучылі нас ва ўніверсітэце, а значна раней. Бо на самой справе...

Тут Максіму давялося прысесці на зэдлік і выслухаць доўгую гісторыю, адкуль паходзіць назва старажытнага мястэчка Ленін і як правадыр пралетарыяту атрымаў свой псеўданім. Па тым часе, а быў толькі пачатак гарбачоўскай перабудовы, падалася яна, гэтая гісторыя, неверагоднай.

Спачатку Павел Паўлавіч распавёў пра ўласна паходжанне назвы мястэчка. Тут мелася некалькі версіяў, а дакладней легендаў і быліцаў. Першая рамантычная — была ў мясцовага пана дачка Алена (Лена), якая закахалася ў простага сялянскага хлопца прыгажуна Алеся. І ён пакахаў яе. Калі пану даклалі цівуны, што дачка таемна сустракаецца з галадранцам, ён загадаў злавіць хлопца. Расправа была жорсткай: Алеся, сведчыць легенда, кінулі ў клетку да дзікіх звяроў... Лена, калі даведалася пра згубу каханага, выбегла на круты бераг ракі, скочыла ўніз і ўтапілася. Паселішча, якое паўстала на тым месцы, пан назваў Леніным у памяць пра дачку... Другая версія — прыземленая і больш падобная да праўдзівай: з дазволу Радзівілаў мястэчка на леннай, што азначае вольнай, зямлі на беразе тады паўнаводнай ракі Случ заснаваў князь Юры Слуцкі з роду Алелькавічаў у пачатку шаснаццатага стагоддзя. Паколькі зямля была леннай, то і паселішча атрымала назву Ленін. Жылі ў ім людзі вольныя, якія займаліся гандлем і рамесніцтвам, а таму пасяліліся тут шмат габрэяў, што прыйшлі з Еўропы... Ну і трэцяя версія зусім простая: з даўніх часоў урочышча на месцы цяперашняга мястэчка называлася Ленін. Назва яго і перайшла паступова на паселішча, якое тут з'явілася і разраслося.

— Як там было насамрэч і адкуль пайшла назва — не столькі важна. Несумненна адно, і цяпер ужо не патрабуе доўгіх доказаў: пад такой назвай нашае мястэчка існавала ад шаснаццатага стагоддзя, задоўга да нараджэння Валодзі Ульянава, а не атрымала яе пасля рэвалюцыі сямнаццатага года ў гонар Леніна, як думалі некаторыя. Больш за тое, яны прыдумалі яшчэ адну легенду пра тое, як нібыта дабіваліся гэтай назвы мясцовыя бальшавікі ў васямнаццатым годзе і як ім не дазвалялі і забаранялі.

Не дзіўна, што з'явілася і такая версія. Блытаніну ўнесла тое, што за паслярэвалюцыйныя трыццаць гадоў мястэчка некалькі разоў пераймяноўвалі. Спачатку палякі, да якіх гэтыя землі адышлі па Рыжскай дамове. Слова Ленін, зразумела ж, рэзала ім слых і сляпіла вочы. Яны назвалі мястэчка, дзе жыло па тым часе больш за тры тысячы чалавек, Згарэлым, а потым у гонар нейкага свайго героя — Сасноковічы. У 39-м годзе Саветы вярнулі назву Ленін, а ў 41-м немцы зноў пераназвалі. А пасля вызвалення ў 44-м Ленін паступова пачаў перайтварацца ў Ленино…

— Куды я толькі ні пісаў. І ў ЦК КПБ, і ў ЦК КПСС, каб пакінулі за намі гістарычную назву — без нейкіх канчаткаў. Ніякой рэакцыі. Мабыць, таму, што ў мяне не было ніякіх доказаў, апроч сведчанняў старажылаў, што мястэчка так называлася да рэвалюцыі, да Леніна. Нават звычайнай карты дзевятнаццатага ці васямнаццага стагоддзя, дзе, вядома ж, нашае мястэчка пазначана як Ленін, у мяне няма. І знайсці не магу. Недзе ў архівах, у Мінску, Маскве ці Ленінградзе яны ёсць, але як патрапіць туды мне, настаўніку з вёскі? Хто мяне пусціць?

Сапраўды, сітуацыя можа падацца абсурднай: зразумела ж, калі мястэчка існавала з шаснаццатага стагоддзя і былі ў ім царква, касцёл, сінагога, прыходская школа, крамы, цагельня тая ж, дык пра існаванне яго павінна застацца шмат дакументаў. Ну няхай, само мястэчка спалілі падчас вайны немцы, але ж архівы недзе захаваліся. Калі не архівы, дык карты. Ніяк то не сакрэтныя. Што за дурасць — адмаўляць мястэчку ў існаванні напрацягу стагоддзяў і прывязваць яго да імя Леніна? У чым тут небяспека для партыйнай ідэалогіі?

Павел Паўлавіч распавядаў далей ужо не так спешна, добра пастаўленым голасам, як экскурсію праводзіў:

— Я думаю, што мяне не дапускаюць да нейкіх дакументаў — невыпадкова. Я зацікавіўся, адкуль ва Уладзіміра Ульянава ўзяўся такі нечаканы і дзіўны псеўданім, падобны да назвы нашага мястэчка? Зусім не рэвалюцыйны, здавалася б, псеўданім, а нейкі нібыта жаночы: Ленін, — Павел Паўлавіч расцягнуў апошняе слова, нібыта смакуючы на язык: Л-е-е-е-ні-і-і-н-н-н. — Чый, адразу хочацца спытаць. І адказаць — Ленін… Нейкай Лены, маўляў. Ракі ці жанчыны… Чаму не такі, як у іншых бальшавікоў? Не жорсткі — Каменеў ці Сталін, не па назве нейкай мясцовасці ці горада — Троцкі, Томскі ці Яраслаўскі… А — Ленін… Прыгожая версія, што ён узяў свой псеўданім ад сібірскай ракі Лена і як памяць пра Ленскі расстрэл, адпала сама сабой, бо час не супадае. Ленскі расстрэл быў у 1912 годзе, а псеўданім Ленін ва Ульянава ўпершыню з'явіўся ажно ў 1901 годзе. Што тычыцца нейкіх жанчын па імені Лена, што былі ва Уладзіміра Ільіча і ў іх гонар ён так назваўся, то не хачу пра тое і гаварыць. Гэта смеху варта… А насамрэч…

Насамрэч таксама ёсць некалькі версій, і яны, на думку Паўла Паўлавіча, звязаныя якраз з ягоным родным беларускім мястэчкам Ленін.

Першая такая: падчас аднаго з ад'ездаў на эміграцыю таварыш Ульянаў праязджаў па мясцінах, блізкіх да мястэчка Ленін. Назва гэтая яму спадабалася і запомнілася таму, што побач была абшчына манахаў ордэна айцоў-камуністаў. А бальшавікі, памятаеце, якраз і былі камуністамі, хоць іх і апярэдзілі з такой назвай пратэстанты-хрысціяне… Другая версія больш верагодная. Мястэчка Ленін да рэвалюцыі на 90 адсоткаў было габрэйскім. Перад ад'ездам на эміграцыю Ульянаў сустрэўся ў Вільні з багатымі ленінскімі габрэямі, якія дапамаглі яму зрабіць пашпарт на імя Мікалая… Леніна. Не доўга думалі, якое прозвішча ўпісаць — згадалі пра сваё мястэчка і вырашылі яго ўвекавечыць. Чаму скарочана Ленін, а не Ленінскі, Ленінаў ці Ленінаўскі — спытаць цяпер няма ў каго.

Спытаць няма ў каго… Гучыць гэта страшна. Рэвалюцыя і дзве вайны, асабліва другая, жахлівым молахам прайшліся па гэтых землях. І ад шматтысячнага габрэйскага насельніцтва ў былым вялікім мястэчку не засталося нікога. Нікога… Усе, хто тут жыў — будаваў, гандляваў, кахаў — цяпер ці ў брацкай магіле ці на могілках, пад старажытнымі драўлянымі помнікамі — мацэвамі. Фашысты адразу, як уварваліся сюды, стварылі гета, і ў 42-м годзе ўсіх, хто быў у ім — мужчынаў, жанчын, дзяцей, старых і малых, забілі, замучылі, расстралялі, а мястэчка спалілі… І гэта асобная гісторыя, якая чакае яшчэ свайго даследчыка. Бо ў тагачасным Савецкім Саюзе тэма гета і халакосту, прынамсі, у Беларусі, усяляк замоўчвалася. Абмінуў яе ў размове з Максімам і Павел Паўлавіч.

Максім пахадзіў па музеі. Кнігі, кнігі, кнігі… Літары кірылічныя і лацініца, іерогліфы, нейкія незразумелыя, раней ніколі не бачаныя, значкі, кручкі і чарвячкі… Было ўражанне, што на свеце не засталося ніводнае мовы, на якую не быў бы перакладзеныя творы Леніна і якая не прысутнічала б тут. Не музей, а бібліятэка, цесна застаўленая шафамі-паліцамі з кнігамі, большасць з якіх ніхто ніколі не разгорне, а калі і разгорне, дык не пачытае. Навошта яны сабраныя тут? І што іх чакае, калі не стане таго, хто іх сабраў, хто сёння так даражыць імі, чахне над імі?

Максім абышоў музей — апроч кніг нічога больш не было. А як жа этнаграфія? Цікавыя маглі б быць якраз экспанаты з мінулага мястэчка. Тая ж цагліна. Сапраўды — а дзе яна? Павел Паўлавіч зразумеў позірк Максіма без пытання.

— Тут толькі кнігі, толькі музей Уладзіміра Ільіча. Бачыце, як шчыльна шафамі застаўлена. Нават не ўсе экспанаты і кнігі, прысвечаныя яму, удалося расставіць, раскласці. А я хацеў бы зрабіць і музей мястэчка. Этнаграфічны. Краязнаўчы. Зберагліся няшмат рэчаў, але яны ёсць. Я іх захоўваю дома. Фотаздымкі, ткацтва, партызанскія дакументы. Цагліна тая ж…

— А чаму цагліна дома? Не даверыце артэфакт Уладзіміру Ільічу? — пасля экскурсіі па музеі-бібліятэцы Максім не ўтрымаўся ад спакусы пажартаваць. Ён сказаў гэта і адразу ж зразумеў, што ляпнуў лішняе. Перад ім чалавек захоплены, адданы ўсім сэрцам справе жыцця, а ён іранізуе — блюзнерыць.

Павел Паўлавіч пакрыўджана пацепнуў плячыма, падціснуў вусны, але стрымаўся:

— Я ж тлумачу — цесна тут… Але, калі хочаце, я магу сёе-тое дома паказаць.

Зразумела, матэрыялу на някепскую публікацыю ўжо было: жывы, маўляў, у вёсцы Ленін энтузіяст, які збірае кнігі Леніна, выдадзеныя па ўсім свеце. Але варта было б разбавіць тэкст гісторыяй мястэчка, можа, і фотаздымкамі цікавымі з мінулага, якія Павел Паўлавіч знайшоў, прозвішчамі ды імёнамі…

І Максім пагадзіўся пайсці да Паўла Паўлавіча дамоў.

Жонка Паўла Паўлавіча сустрэла іх няласкава. «Як няродных», — міжволі падумалася Максіму. Нешта буркнула сабе пад нос, убачыўшы мужа і незнаёмца, што заходзяць у хату, не прывіталася нават, а адвярнулася, нібыта занятая нейкай сваёй справай. Максіма гэта трохі здзівіла, бо, здаецца, дырэктар казаў, што жонка ў Паўла Паўлавіча настаўніца. Яе ж стаўленне было тыповым для простых вясковых ды і гарадскіх жанчын, якое ён не раз бачыў. Так непрыветліва выказвалася звычайна незадавальненне мужам, які прывёў у хату чужога чалавека. Наўмысна прывёў, каб была прычына выпіць. Цяпер частуй яго, стол накрывай… Потым слухай бязглуздыя размовы да ночы. П'яных беларускія жанчыны не любяць. Максім гэта не ўлічыў, і цяпер пашкадаваў, што пагадзіўся ісці да Паўла Паўлавіча.

Сам Павел Паўлавіч ніяк не зрэагаваў на паводзіны жонкі, бачком-бачком моўчкі правёў госця праз вітальню ў суседні пакой. Максім зайшоў за ім, ціхенька прытуліў дзверы, але яны з лёгкім скрыпам прыадчыніліся. «Ну і няхай», — падумаў ён і не стаў зачыняць. У пакоі, які, відаць, быў Паўлу Паўлавічу кабінетам, пасярод, а не каля сцяны ці вакна, стаяў круглы стол, завалены кнігамі і паперамі. Яны селі на два крэслы ля яго, прычым Максім тварам да дзвярэй, а Павел Паўлавіч — спінай. Праз прыадчыненыя дзверы Максіму была відаць пабеленая печ, край жоўтых шпалераў на сцяне і сінія ўваходныя дзверы. Жанчыну ён не бачыў — яна, пэўна, прысела ў тым пакоі за кухонны стол ля вакна. Кабінет Паўла Паўлавіча ўвесь быў завалены рэчамі — у шафе, на шафе, пад шафай, на падваконні, на крэслах, на падлозе, — яны ляжалі і віселі паўсюль, і больш нагадваў музей, чым сам музей. Чаго тут толькі не было!.. Але — першай справай, як і абяцаў па дарозе, Павел Паўлавіч дастаў з шуфлядкі загорнутую ў цэлафан тую самую знакамітую цагліну — пашчарбачаную з усіх бакоў, як абгрызеную пацукамі. Рукі Паўла Паўлавіча дрыжэлі ад хвалявання, калі ён перадаваў Максіму гэты бясцэнны скарб — адзіны доказ таго, што паселішча Ленін існавала і да рэвалюцыі пад такой назвай, нямую сведку мінулага жыцця Леніна да Леніна. На адным з кантаў цагліны было выразна высечана: «О. С. Агарковъ. Ленинъ. Минск. губ.».

Цяпер, амаль праз дзесяць гадоў пасля тых падзеяў, калі пішуцца гэтыя радкі, калі няма СССР і пра Леніна шмат напісана як пра аднаго з катаў-кіраўнікоў бальшавіцкай дзяржавы, які прыдумаў канцэнтрацыйныя лагеры, па загадзе якога высланы і знішчаныя тысячы і тысячы дзеячаў культуры, навукоўцаў, святароў, калі ён перастаў быць вялікім правадыром, імя якога, біяграфія і ўчынкі болей не аберагаюцца ўсяляк і не прыхарошваюцца, а для даследчыкаў адчыніліся архівы, можа падацца дзіўным, што менавіта гэтая цагліна, а не нейкія дакументы ці мапы, стала пацвярджэннем існавання мястэчка Ленін доўгія стагоддзі да той самай рэвалюцыі, якая перавярнула калі не свет, дык Расійскую імперыю. І незразумела, навошта было забараняць згадкі пра мінулае паселішча Ленін і ўслед за белапалякамі ды гітлераўцамі звязваць ягоную назву з Ульянавым-Леніным? Няўжо і сапраўды толькі таму, што псеўданім свой Ленін узяў ад назвы гэтага палескага мястэчка?..

Максім паважна разглядаў цагліну — цяжкую, трохі большых памераў, чым звычайна, і…ледзь не ўпусціў яе на падлогу і не разбіў на дробныя кавалкі, калі раптам расчыніліся ўваходныя дзверы і ў хату зайшоў… чорт не чорт, снежны чалавек не снежны чалавек… а нейкі дзіўны, абраслы неахайнай барадой па самую шапку мужчына. У старым, аблезлым, парэпаным кажуху і трусінай зімовай шапцы з апушчанымі вушамі (хоць на вуліцы не сказаць, каб было холадна), у вязлізных, не па памеры, чорных гумовых ботах, заплямленых карычневым гноем. Разам з ім увайшоў у хату і разбегся па пакоях пах фермы, скіслага малака, дзярма, перагару і застарэлага мужчынскага поту… ад чаго Максіму адразу захацелася калі не сысці адсюль, дык хоць бы зачыніць дзверы. Мужчына між тым спакойна і па-гаспадарку паставіў у кут каля печы вілы, з якімі ўвайшоў у хату, і пачаў распранацца. Максім у другі раз ледзь не ўпусціў цагліну, калі пачуў радасны, поўны пяшчоты, голас жонкі Паўла Паўлавіча: «Пеця! Ну, нарэшце! Галодны? Ну сядай за стол…» Мужчына праз адчыненыя дзверы паглядзеў спадылба на Максіма — працягла, цяжка, і Максіму стала трохі страшнавата. Вілы ў хату ніхто ніколі з працы не браў на ягонай памяці — пакідалі на вуліцы. Навошта ён іх прынёс? І погляд — погляд у чалавека быў нейкі мутны-мутны, як у раззлаванага, шалёнага быка: ён відавочна таксама быў незадаволены тым, што ўбачыў у хаце чужога чалавека.

Жонка Паўла Паўлавіча ўжо мітусілася, інакш і не скажаш, каля печы. Адкінула засланку, дастала чыгунок, і да Максіма, перабіваючы пах мужчыны, паплыў густы, сытны дух баршчу… Міжволі рот напоўніўся слінай, Максім згадаў, што сёння зусім нічога не еў, і пашкадаваў, што адмовіўся ад прапановы дырэктара саўгаса паснедаць.

Між тым Павел Паўлавіч знешне нібыта ніяк не зрэагаваў на з'яўленне Пеці і працягваў распавядаць нешта сваё. Максім вярнуўся вачыма ў кабінет і прыслухаўся.

— …трымаюць мяне тут ледзь не за ідыёта. Добра, што хоць у псіхбальніцу, у Навабеліцу, дагэтуль не адправілі. Але я дакажу, усім дакажу, даб'юся свайго, чаго б гэта мне ні каштавала: мястэчка Ленін з шаснаццатага стагоддзя існуе пад такой назвай. З шаснаццатага стагоддзя! А не з сямнаццатага года… І ніхто, ніколі, ні пад якую палітыку яго не будзе пераймяноўваць!

Толькі цяпер Максім заўважыў, што прыход мужчыны, хоць і сядзеў Павел Паўлавіч спінай да дзвярэй, узрушыў яго і моцна паўплываў на настрой: стаў ён яшчэ больш стомленым і прыбітым, згорбленым і ўнураным у сябе і разам з тым — агрэсіўным, нават злым. Мажліва, сорамна яму было за жонку, якая так холадна сустрэла іх і з такой радасцю кінулася да «пахкага» мужчыны. «Кім ён можа быць ёй? — падумаў Максім. — Сын? Не, мусіць, стараваты будзе для сына. Брат? Можа быць, брат. Дакладна брат. Каго ж яшчэ можна так сустракаць…». А ў суседнім пакоі жонка Паўла Паўлавіча весела шчабятала каля мужчыны, і чутно было, як лілася вадкасць. Булькала, як з пляшкі — значыць, налівала чарку гарэлкі. У адказ на клапатлівую мітульгу каля яго, мужчына нешта буркатаў незразумелае, неразборлівае, няўцямнае, але звярына-ласкавае.

Максім зразумеў, што трэба развітвацца. Матэрыялу на артыкул пра цікавага чалавека і не менш цікавае мястэчка, у нечым і сапраўды сенсацыйнага матэрыялу, — меў рацыю дырэктар, — хапала. Да таго ж вясновы дзень яшчэ не такі і доўгі, а хацелася прыехаць дамоў да цемры.

У канторы Максіма ўжо чакалі дырэктар і Валодзя. Па іх змоўніцка-радасных тварах Максім зразумеў, што мяшок з рыбай, і магчыма не адзін, ужо ляжаў у багажніку «Волгі».

— Дзе гэта ты затрымаўся? — спытаў дырэктар. Ён перайшоў ужо на «ты» да Максіма, а гэта тым болей азначала, што ўсё ў парадку. — Тут жа да музея два крокі.

— Хадзіў глядзець знакамітую цагліну дахаты Паўла Паўлавіча.

— Зразумела… — хмыкнуў дырэктар. — Значыць, бачыў.

— Бачыў. Звычайная цагліна. Толькі з…

— Ды я не пра тое, — перабіў яго дырэктар.

— А пра што?

— Я пра хахаля яго жонкі… Прыняла яна аднаго нашага мужыка. Дурнаватага, двух слоў звязаць не можа. Вучань яе, але школу так і не скончыў. Гаварыць нават толкам не навучыўся. На ферме цялят дагледае… Жыве яна з ім. А ад Паўла Паўлавіча адмовілася. Мусіць, з-за яго любові да Леніна, ха-ха-ха… — дырэктар падміргнуў, каб зразумелі намёк. — Так і жывуць утрох у адной хаце. Я ўжо нават і не ведаю, у каго з іх большыя праблемы з галавой…

***P.S.** Артыкул пра мястэчка Ленін, музей Леніна і краязнаўцу-энтузіяста ў газеце так і не быў надрукаваны… Перабудова толькі набірала ход, і Ленін у правіцы яшчэ заставаўся жывейшым за жывых, а таму не мог ён, ніяк не мог узяць сабе псеўданім з назвы нейкага беларускага мястэчка, хоць сведкай таму і была цагліна.*

У вянок памяці Наталі Санько

Тая, што наталяе

Валянціна АКСАК

Памяці Наталі Санько

Ці згодная ты штодня галадаць з маім
сынам?
Так.
Ці гатовая ты ў бесхацімцах пражыць з маім
сынам?
Так.
Ці здольная ты дзень і ноч працаваць з маім
сынам?
Так.
Ці адважная ты на вечную ссылку ў Сібір
з маім
сынам?
Так.
То блаславаўляю ваш шлюб,
чароўная, моцная, мудрая, верная
Дзева Наталя.
Наталі майго сына
каханнем і клопатам,
сэрцам, душой
і свабодай.
Наталіла
Наталя.

14.04.2019



Наталя Санько ў традыцыйным строі з сынам Кастусём. 6 кастрычніка 1979 г.
Фота Яўгена Куліка

Палёт галубкі

Зянон

Зьмітру і Наталі Санько

Раніца ў садочку,
Вішанька цвіцее,
Куст язміну пад ваконцам,
Зора палавее.

Тут я маладзенькі
Кветачкі зрываю.
А дзе ж мая любка,
Спакою не маю.

Прыляцела зязюлька
З далёкага лесу:
Ку-ку, ку-ку, мой хлапчынка,
Кукуе балесна.

Твая галубе́нька
Адляцела ў вырай,
Скіне пёркі з небашатаў,
Туманом пакрые.

Не кувай, мая зязюлька,
Не кувай мне ў сэрца,
Мне йшчэ трэба ў свеце жыці,
Дзе я спадкаберца.

Цвіце вішня ў садочку,
Палавее зора,
Туман гору адлятае,
Туманы над полем.

21.04.2019


Каля ружоўніка, на Мацерыку

Сяргей ПАНІЗЬНІК

Пад зоркай Наталі Санько

Дзялкі дзялілі з веку ў век
прысады нашы на акрайцы.
Душылі душы. Неслі здзек
і «верноподданные» здрайцы.
Дзяльба — разброды і пасьба
з касьбою наўсутыч, не поруч.
Ратуе жальбу не мальба,
а ўпартае надзеі горыч:
спаўзе ахвота скавытаць, —
бо той, хто праўду-матку лае,
не зможа — вольным — узлятаць:
бяскрыласць — гэта доля злая.
Стаць на Вялікдзень мацаком, —
зайздроснай хцівасці не ўкленчыць!
Ля Курапатаў ланцугом
звяр'ё крыжы пакут нявечыць...
Сябры! На ўздым: адолець злосць,
бо без адзінства жыць — калецтва.
І для прабудкі чынавенства
агудка: — Беларусь не млосць!
Мы — Нацыя:
Скарб Чалавецтва!

13.04.2019



У гасцёх у Ніла Гілевіча. 8 жніўня 2006 г. Злева спадар Зьміцер і спадарыня Наталя

Незавершаны верш

Алесь РАЗАНАЎ

У вянок Наталі Санько

Дзень дадаецца ў знак.
І змога ў снах выносваў
сціскаецца ў кулак,
каб некалі, нанова,

калі на ра́ду дні,
відушчыя, збяруцца,
ў аднойдзіну радні
вяснова разгарнуцца.

Што ёсць — кладзе свае
пазнакі падрахунак.
А кветка дастае
з самой сябе дарунак.

Прадвесце на дварэ.
Пакліканае кімсьці.
Што дасць час — забярэ.
Знайсціся мусіць выйсце.

Адсюль, дзе лічаць нас
хвіліны, важаць вагі,
вядуць у пазачас
відушчыя працягі.

Рой рупіцца ў вуллі,
і раіць плён усклікам,
каб вынік уявлі
ў змест іншага адліку.

Спрадвечны запавет
аберажэ і ўздыме:
глядзіць у кветку свет,
і дома гаспадыня.

Сваё — яно нясе
праўдзівы плён: цярпліва
па літарах — ці ўсе?!. —
ўзнаўляеш «Нашу Ніву».

Адтуль ідуць сюды,
сабраныя ў адбітк,
сляды, нібы суды:
ў людзей свае набыткі.

Вялікі свет: стаім.
Нібыта ўнепрыкметку,
здзяйсняецца ў сваім.
Знаходзяць пчолы кветку.

Што маем — аддаём,
абудзімся, кім будзем.
Глядзіць у вокны дом,
глядзяць у словы людзі.

Слугуеш — там і тут
адводзіш перашкоды.
Які ён, родны кут?!.
Чытаюць кнігу коды.

Прысвечаныя, ў хрост
імёны ўводзяць рэчы,
і ростань навырост.
Прадбачыць ноч сустрэчы.

Шукае сцежку госць.
Бы вынікі прычына,
знаходзіць, хто кім ёсць,
нябесная Айчына.

Інакшыцца сяўбой
усё, што цесна й вузка,
і гутарыць з табой
Хрыстос па-беларуску.

І, пасланцы вясны,
спрадвечнай маладосці,
тлумачаць штосьці сны,
наведаўшыся ў госці.

Што ўрэшце? Што найперш?
Каб словы змест спаткалі,
глядзіць здалёк у верш
спадарыня Наталя.

23.04.2019

Асуджаныя

Міхась СКОБЛА

Наўздагон Наталі Санько

Калісьці існаваў закон такі,
Гісторыя сляды яго не сцёрла:
Забойцы, здраднікі, рабаўнікі
Караліся бязлітасна «на горла».

Падпісваў прыгавор вялікі князь,
Ахвяр да эшафота везлі конна.
Не блякла мудрагелістая вязь
Суровага, залішне аж, закона.

І нам, хоць на двары гуманны век,
Адзін фінал сустрэць наканавана.
І не папросіш ласкі для калек,
І літасці не будзе для каханай.

Не зменіш ні артыкул, ні статут.
Пара прыходзіць сцішыць парыванні.
Мы ўсе, мы ўсе асуджаныя тут
Да найвышэйшай меры пакарання...

23.04.2019

Тэры

Вера ЛОЙКА

Займець сабаку я не хацела. Ніколі. Нават у дзяцінстве. Вёска, дзе яно прайшло, на той час — 60-я гады мінулага стагоддзя — была здаровай і не спітай, людзі трымалі гаспадарку, і ў кожнай жывой істоты — сваё месца і сваё прызначэнне. Каровы, свінні — у хляве, куры ў куратніку, ну, а сабака... Сабака — у будцы, на ланцугу. Узялі на харчы — то ахоўвай хату. Вясковыя дзеці ставіліся да хатніх жывёлаў без піетэту, не памятаю, каб хто з маіх сяброў-суседзяў гуляўся з сабакам. Жывёлы былі хутчэй нагодай нейкіх гаспадарчых абавязкаў — таго папасі, іншага пакармі... Таму — без сантыментаў. Не ведаю чаму, але мае бацькі сабаку не заводзілі. Ад каго там і што ахоўваць? З такім досведам было б нават дзіўна, калі б я захацела трымаць сабаку ў гарадской кватэры.

Шмат гадоў мне ўдавалася неяк адбівацца ад дачкі, якой вельмі хацелася мець дома цюціка. За гэты час у нас пажылі — чарапаха, хамякі, папугай, рыбкі, трусік. Усе яны (акрамя хамякоў, якія для мяне мышы і больш нішто) былі даволі мілымі, але з розных прычынаў надоўга ў хаце не затрымліваліся. То ў фортку вылеціць, як папугай, то нашай зімы не перажыве, як чарапаха. Было шкада, ну а як жа інакай! Узялі адказнасць за жывую істоту і не зберaглі. Кожны раз абяцала сабе, што больш нікога ў дом не бяру, але... Усё было толькі падрыхтоўкай да галоўнай хатняй жывёлы, а гэта, як я цяпер разумею, можа быць толькі сабака.

Ксеніны сябры якраз у той час узялі з прытулку для бадзяжных жывёлаў маленькага сабачку, дзяўчынку, і далі ёй імя Тэры. Яна была ў стане поўнай санітарнай занядбанасці. Калматая — у калтунах і ваўках, дзікаватая — хто ведае, колькі часу прыйшлося ёй гараваць на вуліцы, яна, вядома, мела няшмат шанцаў на цёплы дом і добрых гаспадароў. Вось хлопцы і выбралі яе — маўляў, хто яшчэ такую возьме — выключна дзеля ўратавання жыцця, бо незапатрабаваных сабакаў, не ведаю як цяпер, а тады ўсыплялі. Так гаротнай Тэры паціху пачало шанцаваць.

У дом то яе ўзялі, але ў не надта надзейны, бо гэта была здымная кватэра і жылі ў ёй хлопцы без асаблівага парадку і рэжыму, так што пра двухразовы выгул Тэры заставалася толькі марыць, як і пра нармальнае харчаванне, бо гаспадары былі вегетарыянцамі і прапаноўвалі сабаку то салату з капусты, то макароны з маянэзам, што і самі елі.

Здаралася, што не знаходзілася часу і аднаго разу ў дзень вывесці сабаку на вуліцу. Такім чынам яна набыла адпаведныя звычкі — скажам так, не надта шанаваць чысціню і санітарыю ў кватэры, якая, напомню, была здымнай. Нічога дзіўнага, што ў хуткім часе нашых ратавальнікаў папрасілі на выхад. І паўстала пытанне — куды дзець Тэры? Не здаваць жа яе зноў на Гурскага! Варыянтаў мелася не надта багата, і асноўны быў — завезці ў вёску. Тут і засумавала мая Ксеня, якая паспела сабачку палюбіць, па-магчымасці наведваючы ды выводзячы пагуляць. Было б дзіўна, калі б яна не паспрабавала вырашыць пытанне са мной. Але я сабаку не хацела.

Ну што б вы рабілі на маім месцы? Сабака то чужы, а дачка свая, любімая. Ды яшчэ ў тым «цудоўным» узросце, калі абачлівыя бацькі пярэчыць не рашаюцца... Так пасля енку «я ж Тэры ніколі больш не ўбачу, калі яе ў вёску завязуць» і абяцання «гэта часова, я знайду ёй другі дом», Тэры прыйшла да нас назаўсёды. Як зараз бачу: яна ўвайшла ў кватэру і сціпла села ў куточку пры самых дзвярах. Насцярожаная, знерваваная, недагледжаная — яна не ведала, што чакае ў гэтым чарговым памяшканні і ці стане яно домам. Я вынесла ў той куточак загадзя падрыхтаваную костачку — так і адбылося знаёмства.

Але да таго часу, калі мы сталі адзінай сям'ёй, дзе галоўны — «вядома сабака», шлях быў няпросты. Усе набытыя ў сваім бадзяжным жыцці звычкі Тэры прынесла з сабой. Яна не стала чакаць прагулкі, а прастадушна справіла патрэбу ў выбраным месцы на вялікім дыване, які прыйшлося замываць, пераварочваць, сушыць... Высахнуць ён не паспяваў, таму што раз абранае месца Тэры не мяняла. Надвор'е ў доме сапсавалася. Наш муж і бацька — вялікі прыхільнік чысціні — паставіў пытанне рубам: і ці яна! Я шкадавала Тэры, але трэба ж было неяк выпраўляць становішча. А як? Выйсця я не бачыла.

У той дзень мы з ёй гулялі доўга. Настрой у мяне быў паганы. Падышлі да пад'езда, яна памкнулася да ўваходных дзвярэй, але я дадому не спяшалася — наадварот, адцягвала момант вяртання. Тэры цягнула, яна заўсёды любіла вяртацца дадому. І тут мяне прарвала. Я стала гаварыць з ёй як з роўнай. «Тэры, мы цябе прынялі ў сям'ю, кормім, даглядаем — я на сваю стрыжку не трачу столькі грошай, колькі на тваю. Ты больш не начуеш на вуліцы, не баішся, што цябе ўсыпяць на Гурскага. Мы цябе любім! Чаму ж ты не хочаш жыць па нашых правілах? Не так іх і шмат. Галоўнае — каб ты свае справы рабіла на вуліцы! Вунь муж патрабуе, каб цябе ў доме больш не было. А куды я цябе падзену? Вось адчаплю зараз павадок — і



Яна не любіла міліцыянераў і дворнікаў, і як толькі ўпэўнілася, што цяпер знаходзіцца пад абаронай гаспадароў, стала актыўна брахаць і на тых, і на другіх. Прычым у разрад міліцыянераў трапілі і курсанты ваеннай акадэміі, што знаходзіцца непадалёку ад нашага дома. Не любіла петардаў, феерверкаў — усяго, што звязана з выбухамі і стрэламі

зноў ты будзеш бяздомная, зноў цябе будуць лавіць... Я гэтага не хачу. Але ж выходзіць — ты гэтага хочаш?» Я, вядома ж, не змагла б так зрабіць, і пагрозы мае былі хутчэй голасам адчаю. Тэры ціхенька слухала гэта ўсё і раптам стала на заднія лапкі, паставіла пярэднія мне на калені і паглядзела проста ў вочы. Боль, страх, трывога, абяцанне — усё было ў гэтым позірку. Яна мяне зразумела. Я яе зразумела. І больш мы да гэтай размовы не вярталіся — не было патрэбы.

Але да ідыліі было далёка. Тэры ўвесь час хадзіла насцярожаная, гатовая ў любы момант абараняць сябе, і хіба можна было яе ў тым вініць? Пра сваё ранейшае жыццё яна расказаць не магла, але пра нейкія дэталі можна было здагадацца. Яна не любіла міліцыянераў і дворнікаў, і як толькі ўпэўнілася, што цяпер знаходзіцца пад абаронай гаспадароў, стала актыўна брахаць і на тых, і на другіх. Прычым у разрад міліцыянераў трапілі і курсанты ваеннай акадэміі, што знаходзіцца непадалёку ад нашага дома. Не любіла петардаў, феерверкаў — усяго, што звязана з выбухамі і стрэламі. Магчыма, некалі яна такім чынам і згубілася ў ранейшых гаспадароў. Аднойчы на прагулцы ў пераднавагодні час, калі стрэлы чутны з усіх бакоў, яна спалохалася і кінулася бегчы. Ды так шпарка, што муж яе не дагнаў, прыбег да дому і зусім расстроіўся, калі не ўбачыў сабаку каля пад'езда. Але яна чакала пад дзвярыма кватэры на пятым паверсе. Во было радасці! Не любіла п'яных. Аднойчы мы ехалі ў трамваі з Серабранкі, куды я вазіла яе стрыгчыся. На прыпынку проста праз шкло ад нас стаяла кампанія маладзёнаў з вялізнай пляшкай піва, якую яны перадавалі з рук у рукі, каб прыкласціся да рыльца — на той час гэта яшчэ не забаранялася рабіць на вуліцы. Адкуль Тэры ведала, што ў пляшцы было піва, а не якая-небудзь «кола», я не ўяўляю, але гаўкала яна ў тую шыбку неадабральна і з вялікім імпэтам.

«Прылятала» іншы раз і нам. Тэры не любіла, калі яе бралі на рукі без просьбы. Палохалася. Інстынктыўна яна рэагавала імгненна. Як-як... Зубамі! Усе мы не па разу зведалі яе вострыя зубкі на сваіх пальцах. Але мужу дасталася больш за ўсіх. На той час Ксеня ўжо з намі не жыла, і Тэры аб'ектам аховы і асаблівай любові прызнала мяне. Гэта значыла, што муж не меў права паляпаць мяне па плячы, а ў яго ёсць такая звычка, дакладней — была. Нават пакласці руку на плячо — ні ў якім разе. Нельга са мной спрачацца — усё адно яго словы заглушыць гнеўны брэх. «Каму пасмееў пярэчыць?!»

Вось і тым разам мы спрачаліся. Тэры сядзела на канапе і ўважліва прыслухоўвалася, пераводзячы позірк то на яго, то на мяне. І тут мой муж страціў пільнасць. Ён вырашыў узяць сабаку ў саюзнікі. Наіўны — ён нічога не ведаў пра сабачую любоў і вернасць. Ён падышоў да канапы, нахіліўся да Тэры і сказаў нейкія неабавязковыя словы тыпу «а мы не будзем звяртаць на яе ўвагі, праўда?» І тут раздаўся крык. Таму што гэты адважны маленькі салдацік, упэўнены, што мне неабходна яго падтрымка, хапануў гаспадара зубамі за тую частку цела, якая была найбліжэй. А гэта быў нос.

Тэры імгненна апынулася ў куточку каля ўваходных дзвярэй. Туды яна заўсёды ўцякала, нашкодзіўшы. Ну, а акрываўлены нос давялося прамываць перакісам вадарода і заклейваць пластырам. Трэба сказаць, што Тэры заўсёды ўмела дазіраваць сваю сілу, бо калі б яна сашчапіла сківіцы шчыльней — заклейваць, мабыць, не было б чаго.

Між тым набліжаўся час вячэрняй прагулкі, на якую яны хадзілі разам. Хто каго выгульваў — пытанне было адкрытае, бо мужу, пенсійнае жыццё якога праходзіла ў руху паміж двума экранамі, тэлевізійным і камп'ютэрным, выгул быў патрэбны не менш, чым сабаку. І няма ніякага сумневу, што ў захаванні ім нейкага здароўя і бадзёрасці вялікая заслуга Тэры. Пасля такога здарэння я баялася адпраўляць іх на вуліцу разам. А што, калі ён пакіне сабаку дзе-небудзь у лесе? Не падобна на яго, але хто ведае, на што здольны чалавек, якому толькі што ледзь не адкусілі нос? Але ён неяк надзіва хутка супакоіўся і нават прызнаў, што сам вінаваты. Гуляць яны пайшлі разам і вярнуліся канчаткова заміраныя.

Матэрыяльных стратаў Тэры практычна не прыносіла. На самым пачатку нашага сумеснага жыцця яна нечакана кінулася да маіх ног, абутых якраз жа ў навюсенькія чаравікі. Ці то гэта быў пратэст супраць таго, што я выходжу з дому без яе, ці то проста чаравікі не спадабаліся. На адным з іх яна пакінула доўгую і глыбокую драпіну. З гэтым можна было справіцца толькі адным спосабам — купіць новыя, што я і зрабіла. Дзякуй Богу, чаравікі тыя былі не з ліку любімых рэчаў. Ды і наогул — самыя важныя рэчы зусім не рэчы, хіба не так?

Тэры тымчасам расквітнела. Хораша стрыжаная, добра кормленая, прывычная да ўласнай падсцілкі, а найбольш да гаспадарскай канапы, да прагулак і памытых лапаў — яна аказалася вельмі абаяльнай і элегантнай. Двойчы на вуліцы да нас падыходзілі з просьбай прадаць сабачку, але пра гэта не магло быць размовы — самім трэба! Яна разумела свой поспех і, як любая сапраўдная жанчына, карысталася ім. Калі нам прыходзілася ехаць у грамадскім транспарце, яна выглядвала якую-небудзь сімпатычную маладую дзяўчыну, што стаяла побач, і пачынала з ёй какетнічаць. Як правіла, мы ехалі пасля стрыжкі, і выглядала наша ляля асабліва прывабна, таму абыякавых папутчыкаў не было. Усе імкнуліся пагладзіць яе, пачаставаць цукеркай ці пячэнькай. Аднойчы якраз у такім свежапастрыжаным выглядзе мы спусціліся ў падземны пераход, і мужчына з салідным партфелем, што крочыў насустрач, ахнуў: «Ой, якая! Пачакайце, я ёй шакаладку куплю...» Ён кінуўся да кіёска і быў вельмі расчараваны, калі я адмовілася ад гасцінца, бо сабакам шакалад шкодны.

Працяг на стар. 16 (10) »

« Працяг. Пачатак на стар. 15 (9)

Пастрыжаная, Тэры звычайна прасілася на рукі і важна пазірала з вышыні на прахожых. Напэўна, гэта быў такі рэванш за голад, холад, пабоі і крыўды, за страх і ўвесь той негатыў, які яна зведала за сваё яшчэ зусім нядоўгае жыццё.

Аднойчы мне давялося ўвязацца ў бойку з ратвейлерам, каб ўратаваць Тэры. На прагулцы да яе кінуўся велізарны і злосны сабака без павадка і без намордніка. Гаспадар (калі гэта быў гаспадар) не ведаў, што рабіць. Ён нешта бездапаможна выкрыкваў, а да таго ж быў нападпітку. Сабака не звяртаў на яго аніякай увагі. І тут я ўспомніла, што якраз напярэдадні ў гасцях у адным доме была размова пра тое, як спраўляцца з сабакамі, калі яны выходзяць з-пад кантролю. Жанчына, абазнаная ў гэтай справе, сказала, што трэба біць з размаху нагой, і гэта жывёлу павінна спыніць. Я не паспела ні падумаць, ні спалохацца, як ужо ўрэзала нагой ратвейлеру. Усё сваё папярэдняе жыццё я сабак проста баялася, і пару разоў яны мяне кусалі. Але Тэры трэба было ратаваць! Ратвейлер адскочыў і гаўкаў ужо наводдаль. Я схапіла сваю перапалоханую маляўку на рукі, горда параіла няўдаламу гаспадару памяняць сабаку на кошку, і мы з дэманстратыўнай годнасцю пакінулі поле бою. Пасля гэтага выпадку Тэры стала рэагаваць на словы «там вялікі сабака». Пачуўшы іх, яна прыціскалася да маіх ног, а то і прасілася на рукі. І ўвогуле яна сабак не любіла, колькі кавалераў ні спрабавала звярнуць на сябе яе ўвагу, наша прыгажунька мінала іх абыякава.

Яна любіла дом і сям'ю. Калі мяне не было дома, Тэры бавіла час на канапе, зацягнуўшы туды папярэдне мой тапак. Заўсёды ведала, чый тэлефон падаваў голас, да таго і бегла паведаміць пра званок. Ідучы з працы, ужо з другога паверху — а жывём мы на пятым — я чула радасны брэх. Тэры чакала мяне пад дзвярыма і адчувала маё набліжэнне праз тры паверхі. Калі я накрывала на стол, яна ўважліва сачыла за маімі дзеяннямі. Пакуль ставіліся талеркі, яна яшчэ сядзела ціха, а вось калі побач клаліся відэльцы — неслася клікаць гаспадара вячэраць. Правілы сервіроўкі яна ведала бездакорна. І свой хлеб адпрацоўвала — узяла на сябе абавязкі, якія былі па сілах і выконвала іх.

Некалькі разоў Тэры спрабавала пагаварыць з гаспадаром. Падыходзіла, калі ён сядзеў за камп'ютэрам, і лёгенька стукала лапай па калене. А потым яна намагалася менавіта нешта сказаць, не гаўкала, не — яна сілілася выціснуць з сябе гукі, вельмі падобныя да чалавечай мовы. Калі той адварочваўся да экрана, яна зноў стукала яго лапкай і спрабавала данесці нейкую сваю думку. Шкада, што мы ніколі не даведаемся, што яна мела сказаць.

Хоць мае блізкія і крыўдзяцца за гэта, я заўсёды казала і буду казаць, што мяне ніхто на свеце не любіў так, як Тэры. Ну проста людзі так не ўмеюць. Аднойчы менавіта гэтая вялікая любоў ледзь не разлучыла нас. Напрыканцы лета муж пайшоў у адпачынак, і мы сабраліся ў вёску да маці. Я ж працавала і застацца там з імі надоўга не магла. Толькі на выхадныя. Аўтобусы з Мінску на той час у вёску не хадзілі, як і цяпер. Каб дабрацца да сталіцы, трэба было ісці пару кіламетраў лесам да суседняй вёскі Драбаўшчына, праз якую раз на дзень хадзіў на Мінск аўтобус з Ганцавіч. Вось у нядзелю яны з Тэры і правялі мяне на гэты аўтобус. Напэўна, яна не зразумела, што паеду толькі я, думала, што ўсе разам, як звычайна. Такія сумныя і расчараваныя вочы глядзелі на мяне праз аўтобуснае шкло — душа пераварочвалася. Але нічога не зробіш, сталі жыць паасобку — я ў Мінску, а муж з Тэры ў вёсцы. МТС там цягнуў слаба, толькі калі падняцца на ўзгорак да воданапорнай вежы. Вось там кожную раніцу яны і выходзілі на сувязь. Аднойчы мужу прыйшла ў галаву недарэчная думка. «Давай, — кажа, — я прыкладу ёй да вуха тэлефон, а ты скажы што-небудзь. Паглядзім, як яна рэагаваць будзе». Так і зрабілі. Я сказала Тэры, што сумую па ёй і яшчэ нешта. Як звычайна. Праз нейкі час тэлефануе ўстрывожаны муж: «Сабака прапаў!» Вярнуліся яны з прагулкі, і пакуль гаспадар займаўся ў хаце снеданнем, Тэры з двара знікла. Хоць увогуле яна да гэтага схільнай не была. Пошукі ў бліжэйшых суседзяў нічога не далі — як праз зямлю правалілася. Я адразу зразумела, што здарылася. «Бяжы, — кажу, — у Драбаўшчыну. Яна пачула мой голас і пабегла мяне шукаць. Пабегла туды, дзе мы развіталіся. Толькі хутчэй, бо па часе павінен прыйсці ганцавіцкі аўтобус, і калі яна ў яго забярэцца — больш мы Тэры не ўбачым...» Па дарозе муж сустрэў знаёмую жанчыну на ровары, якая сказала, што маленькі чорненькі сабачка пабег па лясной дарозе ў Драбаўшчыну, і пазычыла яму свой транспарт. З'явіўся шанец дагнаць уцякачку. А ў Мінску я не знаходзіла сабе месца. Уяўляла, як прыйдзе аўтобус і ў расчыненыя заднія дзверы незаўважна шмыгне маленькі камячок, схаваецца пад сядзенне і... паедзе. Дзе, на якім прыпынку яе заўва́жаць і выкінуць з салона? Што з ёй будзе далей? Я пра гэта ніколі не даведаюся. Мой стан быў блізкі да адчаю. І самае прыкрае, што я нічога не магла зрабіць, нічым не магла дапамагчы.

Муж тым часам пад'ехаў да Драбаўшчыны. На лаўцы каля крайняй хаты сядзеў крыху знаёмы мясцовы пенсіянер з дзецьмі. На запытанне ён адмоўна пахістаў галавой — не, не бачыў. Муж кінуўся далей, у напрамку прыпынка. І тут яго дагнаў адзін з хлапчукоў: «Дзядзя, пачакайце... Яна ў нас на гародзе...» І гэта было шчасце! На зваротным шляху гаспадар трымаў руль адной рукой, бо другой прыціскаў да сябе Тэры. Нічога, даехалі. Відаць, яна напалохалася не менш за нас, бо больш такіх рызыкоўных падарожжаў не ўчыняла. Ну і мы не правакавалі. Бывалі выпадкі, калі мне прыходзілася ад'язджаць з дому на нейкі час. Калі я тэлефанавала і пыталася, як там Тэры, заўсёды чула адказ: «Ляжыць пад дзвярыма... Нічога не есць...» Яна заўсёды чакала мяне. Муж дзівіўся: «Гуляю з ёй я, купаю я, кармлю я — а любіць яна цябе...» Так вось мне пашанцавала.

Усе мы змалку ведаем, што жыццё скончыцца. Але — верым ва ўласную несмяротнасць... Ведаем, што сабакі жывуць менш за людзей, але спадзяемся, што нашы будуць побач заўсёды...

Падчас першага візіту на прывіўку ветэрынар вызначыў, што Тэры на той час мела ўзрост прыкладна 3 гады. Амаль 13 яна яшчэ пражыла з намі. Гэта немала сабачых век. То былі для мяне шчаслівыя гады, хоць здараліся і нягоды, і выпрабаванні. Але яна ўмела падтрымаць, як дадзена далёка не ўсім людзям. Як казала дачка — «А што, сабака не чалавек?» О, не — у сабак больш чалавечага, чым у людзей. Калі ўбачыць, што табе цяжка, падыдзе, лізне руку, паглядзіць у вочы — ну што ты, не сумуй, я з табой, усё будзе добра...

Ніхто больш мне гэтага не можа паабяцаць, бо Тэры пакінула нас. Пасля яе сыходу шмат людзей — суседзі, сябры і знаёмыя — дружна пачалі ўгаворваць нас узяць да сябе другога сабаку. Але... я ж ніколі яго не хацела. Ды і навошта мне другі сабака? Ведаючы, як гэта балюча, калі любімая істота сыходзіць "на вясёлку", я нізавошта не змагла б ступіць на гэты шлях ізноў.

Не ведаю, як яно будзе, калі пройдзе больш часу. Пакуль што мне цяжка падыходзіць да акна. З яго добра бачная сцежка, па якой Тэры вярталася з прагулкі. Калі я гляджу туды, то ўяўляю, як хутка яна перабірае зграбнымі лапкамі — хутчэй дадому, да мяне. Невыносна ўсведамляць, што больш Тэры да мяне не спяшаецца. Я таксама не спяшаюся да яе. Але хочаш-не хочаш, некалі ўсё ж прыйдзецца адправіцца ў замежнае падарожжа. Праз безахоўную мяжу, дзе няма мытнікаў, не патрэбныя візы, страхоўкі, ды нават пашпарт. І як толькі я перайду яе, мне насустрач з радасным брэхам кінецца маленькі пушысты камячок. Я настолькі выразна гэта ўяўляю, што, мабыць, так яно і будзе.

Тэры заўсёды дакладна ведала, калі я прыйду.

2019

Усе мы змалку ведаем, што жыццё скончыцца. Але — верым ва ўласную несмяротнасць... Ведаем, што сабакі жывуць менш за людзей, але спадзяемся, што нашы будуць побач заўсёды...

Час вырашаць...

Андрэй КОЗЕЛ



***

Час наступае — час забыцця,
неверагоднасці адкрыцця
дзвярэй, што закрыты былі на ключы,
тых самых, якія нібы палічыў,

пэўна, найлепшым выхадам у
свет. Ды не можаш зрушыць нагу:
карціна такая, што выйсця няма,
калі наступаюць часы забыцця.

***

Час вырашаць, што зло, што закон,
што ёсць апокрыф, што ёсць канон,
і кім напісаны яны ды калі,
і хто валадарыць на гэтай зямлі?

Гэта цікавы час для высноў.
Ён нагадае частку ад сноў:
пра тую, што думаеш «праўда ці не?»,
якой толькі раніцай і не стае.

***

Час ліхалецця, трунаў, мальбы,
час узгадаць, што стала тады
імгненнем найпершым з'яўлення Хрыста:
ці час вызвалення, ці час забыцця?

Час выяўляць, хто будзе, хто не
гучна смяяцца, як упадзе
ікона, што выслізне з рук, або крыж
паміж узгаданым, забытым паміж.

***

І больш у горадзе у гэтым
мяне нічога не трымае.
Ліміт падлічаны на метры —
дайшоў да самага да краю,

дайшоў да кропкі, да прыпынку,
адкуль не будзе ўжо вяртання.
Апошняй згашаны лучынкай
жарыны першага спаткання.

Ну неяк так — не маю візы,
згубіўся шанец апраўдання.
Сваю усмешку Моны Лізы
мне мытнік шле — на развітанне.

І не сустрэнуць так прыязна —
цяплом чароўнай летняй ночы —
як сустракалі светла, шчасна,
лагодным ззяннем яе вочы.

Бо неяк зніклі несвядома
маіх надзеяў-мар парады.
Я б мог вярнуцца зноў, вядома...
ды больш не будуць мне тут рады.

***

Нам ніхто не паверыць:
мы закрытыя ў душах.
Хто не ведае меры,
той заўсёды і душыць.

Нас ніхто не ўратуе —
ўжо акрэслены межы.
Хто заўсёды лякуе,
той, нарэшце, і рэжа.

Мы загінем гурбою:
цудаў тут не бывае.
Хто трымаўся за зброю,
той з яе і страляе.

Што адбудзецца заўтра —
многім рукі развяжа.
Той, хто ведае праўду,
нам яе не раскажа.

— Хто нас пляжыць у цемры? —
ты спытаеш наіўна.
— Гэта наша краіна!
Нам ніхто не паверыць.

***

Замест ежы —
білет у замежжа.

Замест волі —
пабольш нам нядолі.

Замест праўды —
хлуслівыя мантры.

Замест мовы —
чужынскія словы.

Замест сонца —
дажджы льюць бясконца.


Замест заўтра —
мінулага карты.

Замест сёння —
п'янкое бяссонне.

«Узвысіцца над рэчаісным»

99 нумар часопіса «Дзеяслоў» адкрываецца нізкай вершаў пісьменніка філасафічнага складу Ігара Бабкова.

У гэтай паэтычнай падборцы пад назвай «Вершы Францішка» няма пэўнасці ў адлюстраванні жыцця, але шмат сэнсаў, якія акупуюць бяссэнсавую прастору нашага быцця. Такая тонкая метафарычная матэрыя, насычаная духоўнасцю і глыбокімі філасафічнымі падтэкстамі... Бабкоў апошнім часам шмат піша і шмат прамаўляе.



Магчыма, што ён шукае той сэнс жыцця, у які ўвесь чалавек не ўкладваецца, а часткова пакідаецца ў сваіх праявах мастацкай творчасці і філасофскіх спасціжэннях.

Малое сэрца рыхтык,
як птушанятка
корпаецца ў найбліжэйшым,
сочыць за кожным гукам
цешыцца сярод дробязяў,
але з вялікаю верай
у цеплыню і міласць,
і ў дакладнасць свету

Вядомая міфа-гістарычная пісьменніца Людміла Рублеўская ўсё-ткі змусіла нас звярнуць сур'ёзную ўвагу на сваю творчасць і сучасны айчынны кінематограф. Часопіс друкуе яе кінааповесць-фантасмагорыю па матывах гістарычных хронік «Пад залатымі трубамі» (па сутнасці гэта кінасцэнарый). Назоў не надта каб... Аднак гэта не так важна. Чытач (і магчымы глядач) апынаюцца ў сярэдзіне XVI стагоддзя на абшарах ВКЛ, дзе раскручваюцца інтрыгі паміж князямі Радзівіламі і каралём Жыгімонтам ды яго сужэнкай-італьянкай каралевай Бонай Сфорца за пераемнасць улады... Перад намі — шэраг зменлівых кароткасюжэтных сцэнаў у каралеўскіх палацах Кракава, Варшавы і княскім замку Нясвіжа і маёнтку Гаранёны... Пах і страх атруты пераследуе сямейную дынастыю паўсюль. Асабліва звяртае на сябе ўвагу змаганне паміж Бонай Сфорца і сёстрамі Ганнай і Барбарай Радзівіл. Не абыходзіцца, як і ва ўсякім творы мастацтва, без дзіўнаватых фантазій аўтара. Але яны даволі праўдападобныя і не выклікаюць вялікага недаверу. А да таго ж — сцэнар, што рэдка здараецца, чытэльны і займальны. А ўжо як будзе тое глядзецца на экране, калі фільм усё ж з'явіцца, то ўжо будзе залежыць ад таленту кінарэжысёра...

«1530 г. Кракаў. Каралеўскі палац. Жыгімонт Стары незадаволена ўсаджваецца ў крэсла. Перад ім — Радзівіл Геркулес і Яаб Магнус, які трымае куфэрак.

— Я згадзіўся на гэтую сустрэчу ў памяць нашага старога сяброўства, Юры. Але я не памяняю свайго слова. Пасада канцлера, якая вызвалілася пасля смерці тваёго брата, будзе належаць Альбрэхту Гаштольду, Радзівілы і так маюць уладу большую за маю.

Геркулес апускае вочы, каб не выдаць гнеў.

— Але Радзівілаў на гэтым свеце застаецца ўсё менш, ваша каралеўская мосць. Я прашу толькі аб каралеўскім правасуддзі.

Друкуюцца вершы Ігара Сідарука. Яго лірыка кахання «Я думаў, ты верасень чысты...», як мне падаецца, у сваёй пераважнасці залішне эмацыйная і не дарэшты вывераная ў суадноснасці слоў і адчуванняў. Вершаў шмат, ёсць і выбітныя рэчы:

А я сказаць адной табе хачу,
Як у самоце патанае вечар.
І толькі ветру тое я шапчу,
Аб чым з табой ужо даўно маўчу,
Маўчанне што ж,
таксама добра лечыць.

Леанід Дранько-Майсюк назваў працяг сваёй архіўна-літаратурнай працы «У Вільні і больш нідзе...» аповесцю пра Адама Станкевіча, не дапасоўваючы сюды слова дакументальнай... І напраўду, цягам густоўнага аповеда вымалёўваецца цэльны вобраз вядомага святара і асветніка, згіблага ў ГУЛАГу праз бальшавіцкую крывавую ідэалогію. З датклівым пачуццём павагі выпісаныя і ўзноўленыя (станоўчыя і спрэчныя) штрыхі ягонай біяграфіі, творчасці і жыццядзейнасці, у рэшце рэшт, паказваюць нам Адама Станкевіча як беларуса ва ўсёй яго нацыянальнай годнасці і чалавечай іпастасі. Мяркую, чытачу будзе цікава азнаёміцца і з такой вытрымкай з шырокафарматнага тэксту аповесці:

«У маладым заходнебеларускім лагеры сварка і разлад прайшлі праз усе адведзеныя гісторыяй скупыя гады; удзельнікі руху дзялілі не грошы, маёмасць і славу, а перш за ўсё мелі розныя светапогляды. Шырокі ў сваім кругаглядзе А. Луцкевіч, скажам, хваліў Леніна і цаніў Кальвіна, які сваімі навучаннямі па-сутнасці стварыў падмурак для капіталізму; Адам жа Станкевіч вышэй за Кальвіна, капіталізм і Леніна ставіў Ісуса Хрыста. Айцец А. Станкевіч лічыў: палітыка, якую праводзіў А. Луцкевіч і, напрыклад, падпольны камуніст Б. Тарашкевіч, мяжуе з небяспечным летуценнем, з авантурызмам; нацыянальная работа не павінна адыходзіць ад хрысціянства. Зрэшты, бліся нават не за ідэі, бо ідэя была адна — Беларусь; кожны біўся за свой партыйны гурт; нястомна, бясконца змагаліся за лідэрства, хацелі пад свой уплыў узяць нацыянальны рух — словам, амаль кожны прагнуў забраць у свае рукі справу».

Вершы Віктара Слінкі нечым няўлоўным падобныя да вершаў І. Бабкова. Аднак калі ў Бабкова як чытач я шукаю і знаходзіў сэнсы, то ў Слінкі іх амаль немагчыма вылавіць і намацаць, бо ў яго творах няма межавых сцэн (скажам, яго мастацкая сфера не асцэнена), там спрэс адтуленая прастора, з якой, як ні дзіўна, няма выратавальнага выйсця...

...Люстраная́ прастрань
характва.
Выцвіласць адсеяных імгненняў.
Пазачасавасці — не схаваць
Повязяў удзячнасці, — ўзаемна...

Мемуарную прозу Міколы Гіля чытаць цікава, асабліва прыхільнікам літаратуры сталага і старэйшага пакаленняў; яго аповеды жыватворна бруяць беларушчынай (не ў нацыянальна-палітычным сэнсе, а ў сваёй рэчаіснай — учарашняй і сённяшняй — натуральнасці). Прырода і людзі бацькаўшчыны паўстаюць ва ўсіх сваіх праявах жыцця. Вось і гэты аповед: выбраўся літаратар на сваю малую радзіму, Лагойшчыну, а там мала што з пазнавальнага і засталося, то паехаў ён на веласіпедзе па ваколіцах і сустрэў бубулю з каровай на пасьве; прыпыніўся, разгаварыліся... І вось яна ўспамінае сваіх шэсць кароў — усё сваё жаночае жыццё — а разам з імі, можна сказаць, і ўсю нашу беларускую калгасную долю... «Усё добрае пачынаецца з павагі да чалавека, а ўсё благое — з непавагі да яго. Непавага, сцвярджэнне нікчэмнасці і таннасці чалавека ўзгадоўваюць лёкайства, падхалімства, зайздрослівасць, халуйства, прадажнасць, несумленнасць, двурушніцтва, безадказнасць, абыякавасць і — тое ж п'янства. Доўгія гады нам казалі, што чалавек — гэта гучыць горда, а самі рабілі зусім іншае, відочна паказваючы і сцвярджаючы, што чалавек — гэта казюрка, чарвяк, шрубачка, пылінка, нішто. І людзі выраслі казюркамі, чарвячкамі, шрубкамі».

Вершы з нізкі Тадоры Шпількі (Тацціяны Будовіч) пад назовам «Хачу стаць словам для цябе...» найперш вызначаюцца ўнутраным настроем і цёплай пачуццёвай аўрай.

Мне цяжка зразумець, чаму лірычная паэтка абрала для сябе гэткі сатырычна завостраны літаратурны псеўданім. Ён не тое што не пасуе, а ад пачатку зніжае тонус успрымання насамрэч узвышанага стылю і трапяткога голасу паэткі:

Ды німбам выратавальны купал
па-над галавой
і стропы — як ніці лёсу
ці марыянеткі,
што там, на нябёсах, трымае
Той,
Хто загадзя ведае, як упадзе
падкінутая манетка.

Апавяданне Алеся Гізуна з Баранавіч «Дзень апошняга яблыка» прысвечана памяці земляка, адметнага творцы Яна Збажыны. Яно нечым блізка напамінае мне творчасць самога адышоўшага літаратара, калі брашь пад увагу яго помныя тэксты афарыстычнага кшталту.

«...той, хто мае свой час, часцяком страчвае ўсялякую здольнасць ягонага ўліку. Фізіка часу не адмаўляецца, але перадольваецца. Час, нібы рака: ты стаіш у ёй, яна адчувальна, але несувымерна цячэ паўз цябе, ціхая і магутная плынь вады. Пакуль ты ў вадзе — ты ў сваім часе, ты — частка яго. Чапай нечапанае. Чэрпай невычэрпнае. Сузірай і асэнсоўвай. Але варта выйсці на бераг, далучыцца да ўсеагульнае гонкі — і той час незаўважна й незваротна сплывацьме па-за табою...»

Мяркую, кожны, хто не адрынае творчы метад экзістэнцыі, зразумее і ўспрыме метафарычныя пасылы паэта Вадзіма Кораня. Ягоны трыпціх «Existenz» прысвечаны памяці мамы (у паралельнай прывязці яе вобраза да біблейнай Марыі)... Адчуваецца творчы рост паэта і яго мастацкі патэнцыял адносна яго папярэдніх публікацый.

Марыя!
Ты была побач,
калі Ён канаў
на крыжы,
Ён бачыў цябе, і Яму,
пэўна,
яшчэ больш балела...
Цікава, а як бы Ён
далей жыў,
калі б
ТЫ
на Ягоных руках
памерла?..

Ідэю і сэнс апавяданняў Паліны Качатковай чытачу даводзіцца разгадваць нераўнуючы як зменлівыя ўзоры ў калейдаскопе: зрух — і новы малюнак з тых жа рысаў і фарбаў, толькі ў новым ракурсе...

З прозай дэбютуе Аляксандра Хамянок (імпрэсія «Ліст у будучыню»). Па гэтай цытаце вы збольшага можаце меркаваць пра творчасць аўтаркі:

«Сачыненне я напісала на «выдатна». Хутчэй за ўсё гэтую адзнаку мне паставілі авансам: у настаўнікаў часта ёсць асаблівае чуццё, што добрая адзнака можа ператварыцца ў нешта большае. У маім выпадку так і здарылася. За што і дзякую, бо я нарэшце зразумела, пра які страх распавядала Святлана Аляксандраўна, пра які страх пісала мне мая бабуля. А зразумець — значыць стаць крыху смялейшай».

Выдатная, я сказаў бы, геніяльная лірыка дарэвалюцыйнага Уладзіміра Маякоўскага ў перакладах Андрэя Хадановіча. Вось:

Ты, што сэрца абакрала мне
і ранаю
развярэдзіла ў душы ўсю
брыду маю, —
дар мой прымі, каханая,
можа быць, я нічога больш не
прыдумаю.
Сённяшні дзень фарбуйце —
у святы.
Творыцца
роўная крыжу містэрыя.
Бачыце, як
прыбіты, распяты
цвікамі слоў на паперы я.

Вялікі тузін непрычасаных думак непераўзыдзенага Ежы Ленца пераклаў Міхась Міранові́ч. Да прыкладу: «Жыць вельмі шкодна. Хто жыве — той памірае».

Тых нешматлікіх з чырвонай кнігі літаратуры, якія займаюцца альбо цікавяцца крытыкай, можна адаслаць да «круглага стала», што ладзіўся з прычыны яе нездаровага стану з удзелам В. Акудовіча, І. Бабкова, Ц. Чарнякевіча, Н. Грышчук, Я. Новіка, А. Адамовіча, М. Бараноўскага і З. Савельева.

«Дык крытыка ёсць ці крытыкі няма? Літаратура мае ў ёй патрэбу ці крытыка мае патрэбу ў літаратуры? На колькі адсоткаў праяўляецца стужка літаратуры, калі срэбра не вымываецца крытычнай кіслатой?» — упарта і бесспадзеўна дапытваўся ў сабранага гурта Ціхан Чарнякевіч. На што Валянцін Акудовіч безапеляцыйна даводзіў: «Слухайце, у нас сітуацыя вельмі простая: сімвалічны капітал не канвертуецца ў грошы. І калі незнаёмыя людзі даведваюцца, што ў мяне за мяжой выдаваліся кніжкі, а я пляшку самага таннага віна не заўсёды магу сабе дазволіць... Яны нічога не разумеюць».

Вядомая дыктарка Зінаіда Бандарэнка дзеліцца ўспамінамі пра былога старшыню Беларускага тэлебачання і вядомага паэта Генадзя Бураўкіна.

Шаноўны Кастусь Цвірка (часопіс віншуе яго з васьмідзесяціпяцігоддзем, а мы далучаемся!) распавядае пра сваю выдавецкую працу ў «Беларускім кнігазборы» ў 2016 годзе, піша пра вядомых вучоных, пісьменнікаў і проста людзей з глыбокім нацыянальным каларытам, не абыходзячы неардынарных бакоў і свайго ўласнага жыцця.

Выбітны філосаф Валянцін Акудовіч працягвае публікацыю урыўкі з новай кнігі «Трэба ўявіць Сізіфа шчаслівым. (Хроніка беларускага інтэлектуала)». Гэтым разам ён піша пра «Інтэлектуалаў і Плошчу».


Друкуецца працяг артыкула «Вёска Камаровічы ў Мазырскім павеце» польскай пісьменніцы Эмы Яленскай пра быт, жыццё і гісторыю палешукоў у перакладзе выдатнага нашага фальклараыста Уладзіміра Васілевіча.

Літаратуразнаўца з Гомеля Ірына Бароўская разважае пра песенную лірыку М. Танка, Н. Гілевіча і Г. Бураўкіна. Літаратар Уладзімір Сіўчыкаў прапануе ўвазе чытачоў свае «штрыхі да партрэта Івана Міско». Леанід Галубовіч рэцэнзуе зборнік балад выбітнога творцы Уладзіміра Арлова «Паручнік Пятровіч і прапаршчык Здань». А ў традыцыйнай рубрыцы «Дзеяпіс» можна азнаёміцца з анатацыямі да кніг, што нядаўна пабачылі свет.

Таму — чытаем! І — прасвятляемся ў нашым цёмным царстве. Альбо — не чытаем і — жывём там жа навобмацак...

ЛеГал

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 5 (153) | 31 траўня 2019 | № 20 (631) Новы час



Новая кніжная сталіца свету

Новай кніжнай сталіцай свету стала Шарджа — трэці па велічыні горад Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

Гэты ганаровы тытул прысуджаецца за выдатныя дасягненні ў папулярызацыі чытання і дзейнічае адзін год. Раней кніжнымі сталіцамі былі такія культурныя цэнтры, як Мадрыд (2001), Александрыя (2002), Нью-Дэлі (2003), Антвэрпэн (2004), Манрэаль (2005), Турын (2006), Амстэрдам (2008) і іншыя.

Шарджа выбрана не выпадкова, паколькі эмірат актыўна падтрымлівае інавацыйныя і інклюзіўныя праекты ў сферы літаратуры.

У гонар гэтай падзеі ў амфітэатры «Аль Маджаз» у эміраце Шарджа прайшло шоў «Тысяча і адна ноч: апошняя частка», у стварэнні якога ўдзельнічалі 537 прадстаўнікоў 25 народаў. Пастаноўшчык грандыёзнай падзеі стаў адзін з рэжысёраў цырымоніі адкрыцця зімовай Алімпіяды ў Сочы Себасцьян Салдэвілья, якога аматары тэатра ведаюць і па мюзіклу «Каралева цырка».

Папулярныя аўдыёкнігі?

Як сведчаць апошнія даследаванні цэнтраў Edison Research і Triton Media, у 2019 годзе 50% амерыканцаў аддалі перавагу аўдыёверсіям літаратурных твораў, а не папяровым кнігам.

Такая папулярнасць аўдыёкніг, лічаць сацыёлагі, можа быць абумоўлена ростам ліку прыхільнікаў літаратуры, якія знаёмяцца з кніжнымі навінкамі ў аўтамабільных корках і падчас заняткаў спортам. 74% «чытачоў» рэгулярна слухаюць кнігі ва ўласных машынах, яшчэ 19% робяць гэта дома і нават выкарыстоўваюць для праслухоўвання стэрэасістэмы.

Апытанне паказала таксама, што 42% слухачоў — былі за 18 гадоў. Даследаванне пацвердзіла папулярнасць аўдыёкніг і ў маладога насельніцтва ЗША. 55% аматараў аўдыё не дасягнулі 45 гадоў.

У сярэднім за апошнія паўгода кожны жыхар ЗША праслухаў 6,5 твораў, а некаторыя — і 10. Больш за палову апытаных прызналіся, што сталі надаваць больш часу праслухоўванню літаратурных твораў, а не музыкі ці радыё.

Самымі папулярнымі жанрамі па-ранейшаму застаюцца трылеры, дэтэктывы і фантастыка, а таксама публіцыстыка, гісторыя, навука і біяграфіі вядомых людзей.

Прэзідэнт Simon & Schuster Audio Крыс Лінч адзначыў: «Новыя дадзеныя толькі пацвярджаюць нашую ўпэўненасць у пазітыўным развіцці гэтага сегмента: аўдыёкнігі імкліва набіраюць папулярнасць, і адбываецца гэта ў асноўным дзякуючы людзям, якія гатовыя і хочуць асвойваць новыя тэхналогіі для самаразвіцця, 50% — гэта вельмі добра, аднак у будучыні мы чакаем яшчэ большыя лічбы».

«Чырвоны каптурок» і сэксізм

Некалькі школ Барселоны разглядаюць магчымасць выключэння з бібліятэкаў некаторых дзіцячых кніг пасля таго, як адна навучальная ўстанова назвала «стэрэатыпнымі і сэксісцкімі» каля 200 кніг.

У спіс увайшоў, у прыватнасці, «Чырвоны каптурок». Праверка 600 кніг, якія былі прадстаўленыя ў дзіцячай бібліятэцы школы Tàber, прайшла ў межах праекта па выяўленні схаванага сэксісцкага кантэнту. Разглядаўся кожны персанаж кнігі, тое, што ён казаў і якую ролю. 30% кніг былі прызнаныя ў вышэйшай меры сэксісцкімі, стэрэатыпнымі, якія не маюць педагагічнай каштоўнасці...

У спіс увайшлі некалькі версій «Чырвонага каптурка» і гісторыя святога Георга, заступніка заказаных. Менш стэрэатыпныя версіі твораў у бібліятэцы ўсё ж пакінулі.

Кніга нечалавека?

У кніжным аддзеле online-крамы Amazon, які мае тысячы электронных кніг, з'явілася новае выданне ад Springer Nature. Кнігу напісаў не чалавек, а алгарытм, які выкарыстоўвае прынцыпы машыннага саманавучання.

Зрэшты, выданне не стала цікавым мастацкім творам, але і было яно задуманае зусім дзеля іншых мэтаў.

Алгарытм, які стварыў тэкст, распрацавалі спецыялісты ў сферы штучнага інтэлекту з лабараторыі Прыкладной камп'ютарнай лінгвістыкі ўніверсітэта Гётэ ў нямецкім Франкфурце. Мэтай стварэння гэтага алгарытму стала не «замена» аўтараў мастацкай літаратуры, а спроба зрабіць падборку-дайджэст з усёй масы сусветных даследаванняў, якія звязаныя з літый-іённымі акумулятарамі.

За апошні час навукоўцы і навуковыя групы з розных краін апублікавалі ў інтэрнэце каля 53 тысяч артыкулаў і вынікаў даследаванняў, якія праводзіліся ў названай сферы толькі на працягу трох гадоў. Тэма літый-іённых акумулятараў вельмі запатрабаваная, бо гэтыя прылады выкарыстоўваюцца ў электрамабілях, камп'ютарах, тэлефонах, гадзінніках.

І чалавек не можа перапрацаваць аграмадную колькасць навуковых тэкстаў, трымаючы «руку на пульсе» гэтай тэмы. Аднак з гэтым цалкам можа справіцца спецыялізаваны алгарытм, які здольны правесці хуткі аналіз тысяч публікацый. Дадзеныя аналізу сістэматызуюцца і напаўняюць базу, якая з'яўляецца асновай для працы алгарытму.

Кніга, аб'ём якой 180 старонак, уяўляе сабой асноўныя вытрымкі для навукоўцаў і даследчыкаў: ім цяпер не трэба пераглядваць тысячы дакументаў.

Распрацаваны алгарытм не абмежаваны толькі сферай літый-іённых акумулятарных батарэй. Яго можна пераарыентаваць на стварэнне зборнікаў у любой сферы навуковых даследаванняў. І ўжо хутка такія дайджэсты будуць складаць індывідуальна на аснове спецзапытаў ад розных навуковых устаноў і даследчых груп.

Дом, дзе напісана «Рамэа і Джульета»



Як паведамляе выданне «CNN London», у Лондане гісторыкам знойдзены дом вялікага ангельскага паэта і драматурга Ўільяма Шэкспіра, дзе ён напісаў несмяротную драму пра каханне «Рамэа і Джульета».

Згодна з новым даследаваннем тэатразнаўца і гісторыка, упершыню дакладна было ідэнтыфікавана месцазнаходжанне лонданскага дома Шэкспіра, дзе драматург напісаў «Рамэа і Джульету».

На пошукі дома ангельскага драматурга і паэта гісторыку тэатра Джэфры Маршу спатрэбілася цэлае дзесяцігоддзе. Ён старанна даследаваў архівы і старыя дакументы, каб вызначыць, дзе жыў Шэкспір у 1590-х гадах.

Пошукі пачаліся пасля таго, як у 2008 годзе быў знойдзены Елізавецінскі тэатр ва Усходнім Лондане.

Раней было ўстаноўлена, што Шэкспір жыў у цэнтры Лондана, побач са станцыяй Ліверпуль-стрыт, у той час вядомай як прыход St. Helens, але дакладнае месцазнаходжанне так і не было вызначана.

Паводле інфармацыі Марша, усе дадзеныя сведчаць аб тым, што Шэкспір жыў у доме з выглядам на царкоўны двор St. Helens, арандуючы яго ў гільдыі гарбароў. Няправільнае напісанне стварала цяжкасці для расшыфроўкі і інтэрпрэтацыі дакументаў, але Марш змог прааналізаваць запісы, якія былі «выдатна» захаваныя — пачынаючы з 1550-х гадоў.

Джэфры Марш, які з'яўляецца дырэктарам Дэпартамента тэатра і перформансу Музея Вікторыі і Альберта, адзначыў: «Месца, дзе Шэкспір жыў у Лондане, дае нам больш глыбокае разуменне натхнення для яго-най працы і жыцця. Некалькі гадоў пасля пераезду ў Лондан з Стратфарда ён жыў у адным з самых багатых прыходаў горада, побач з уплывовымі грамадскімі дзеячамі, заможнымі міжнароднымі гандлярамі, паважанымі лекарамі і дасведчанымі музыкамі».

Гісторык дадаў, што пражыванне ў такім месцы, як Лондан, «палепшыла статус Шэкспіра, паколькі ён развіваў сваю кар'еру, расшукваў свой фамільны герб і планаваў купіць вялікі дарагі дом».

Знішчаецца музей Набокава?

Паводле паведамлення otr-online.ru, у Санкт-Пецярбургу руйнуюць дом-музей пісьменніка Уладзіміра Набокава, каб перарабіць яго ў музычную школу.



Гэты дом з'яўляецца адзіным у свеце музеем Набокава, акрамя сядзібы Каляды ў сяле Каляды Гатчынскага раёна.

Дом №47 на Вялікай Марской належаў сям'і Набокава з 1897 года. Там літаратар нарадзіўся і пражыў да Кастрычніцкага перавароту. Пасля ад'езду з Расіі пісьменнік жыў толькі ў гасцініцах, а пра пецярбургскі дом захоўваў самыя цёплыя ўспаміны, называючы яго «адзіным у свеце домам».

Цяпер дом зачынены для наведвання, паколькі ўнутры ідзе рамонт — знімаюць ляпніну і драўляныя ўпрыгожванні, а экспанаты накрытыя плёнкай. «У доме, дзе меншую частку займае музей, ідзе рамонт, — паведаміў журналісту супрацоўнік музея. — Работы вядуцца ў памяшканнях, якімі ў цяперашні час валодае музычная школа. Але ўваход у будынак адзін. Таму музей і зачынены для наведвальнікаў».

Музей Набокава створаны ў 1993 годзе і займае першы паверх дома, дзе нарадзіўся і жыў пісьменнік да вымушанага ад'езду з Расіі. З тых часоў нязменным застаўся інтэр'ер у некалькіх пакоях. Калекцыю адзінага ў свеце музея Набокава сфарміравалі з прадметаў прыватных калекцый. Сын пісьменніка Дзмітрый Набокаў перадаў некаторыя экспанаты: алоўкі, рабочыя карткі з рукапісамі, пенснэ, гульню «Скрэббл» з аўтографамі пісьменніка, а таксама сачок для лоўлі матылькоў.

Цяпер у музейнай калекцыі прадстаўлены асабістыя рэчы пісьменніка і ўнікальная калекцыя першых выданняў яго твораў, падрабязна асвятляецца гісторыя сям'і і культурная спадчына Набокава ў Расіі і за мяжой. Каштоўную частку складае і адзіная ў Расіі калекцыя матылькоў Набокава.

На базе музея вядзецца навукова-даследчая работа, праходзяць канферэнцыі літаратуразнаўцаў, адукацыйныя школы для студэнтаў і аспірантаў, чытанні мастацкіх твораў і музычныя вечарыны, арганізуюцца часовыя выставы.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by